ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьвыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. Скідка 10 проц. -ваньку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ, 9 сакавіка 1930 г.
№ 57 (3565)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Аб становішчы ў Гомельскай партарганізацыі

Пастанова ЦК і ЦКК УсеКП(б) ад 23 лютага г. г.*)

1. Ухваліць меры, прынятыя ЦК і ЦКК КП(б)Беларусі ў справе выпраўленьня апартуністычных памылак Гомельскага АК КП(б)Беларусі.

2. Канстатаваць у той-жа час, што рад выяўленых памылак не знайшоў своечасовага выпраўленьня з боку вышэйшых кіруючых парторганаў Беларусі.

3. Прыняць да ведама заяву тав. Калініна, што тав. Малаковіч адазваны з Гомельскай арганізацыі і што пленумам Гомельскага акругкому гэта пастанова праведзена ўжо ў жыцьцё.

4. Зьвярнуць увагу ЦК і ЦКК КП(б)Беларусі на выяўленыя факты няправільнага ўмешваньня Гомельскай партарганізацыі ў судовыя справы, наперакор пастановам партыі, якія ёсьць па гэтым пытаньні.

***

Зьмяшчаючы гэту пастанову, «ПРАВДА» піша:

«Рэдакцыя са здаваленьнем канстатуе, што ЦК і ЦКК Беларусі, хаця і з некаторым спазьненьнем, прынялі рашучыя меры для аздараўленьня Гомельскай арганізацыі і для аднаўленьня Гомельскага партыйнага кіраўніцтва, якое дапусьціла цэлы рад буйных апартуністычных памылак.

Паводле пастановы ЦК і ЦКК Беларусі зьняты з кіраўнічай работы ў Гомелі: сакратар АК—Малаковіч, загадчык аргінструктарскім аддзелам — Взнда, загадчык культпропам — Куніца, сакратар парткалегіі — Кліменка, старшыня АКК — Зэмнек, сакратар гаррайкому — Лісковіч, сакратар Залінейнага райкому — Рак, сакратар Нова-Беліцкага райкому — Віханаў. Многія з гэтых таварышоў атрымалі партыйныя спагнаньні. ЦКК абвясьціла вымову ўсяму складу прэзыдыуму АКК. Абвешчана вымова членам камісіі, у тым ліку і члену ЦКК Беларусі—Прусаковай, якая расьсьледвала справу рабкора Мяжэньнікава. Суровая вымова абвешчана рэдактару газэты «Полесская Правда»—Рычкову. ЦКК абвясьціла вымову памочніку акругавага пракурора Ліпскаму, паставіла на від акруговаму пракурору Нікольскаму і старшыні акрсуду — Шэйдліну. Абвешчана строгая вымова і зьняты з работы нарсудзьдзя Ліпаў, які судзіў рабкораў Мяжэньнікава і Маркава.

ЦК і ЦКК Беларусі прынялі рад рашучых арганізацыйных мерапрыемстваў, накіраваных да аздараўленьня Гомельскай арганізацыі і да выпраўленьня дапушчаных ранейшым кіраўніцтвам памылак.

Зараз задача ўсяе Гомельскае партыйнае арганізацыі на аснове рашучай барацьбы з апартунізмам, на аснове разгортваньня самакрытыкі, унутрыпартыйнай дэмакратыі дасягнуць бальшавіцкіх тэмпаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Роля газэты «ПРАВДЫ» адзначае значную ролю газэты «ЗЬВЯЗДЫ» ў выпраўленьні памылак, адзначаных ЦК і ЦКК КП(б)Беларусі».

*) Зьмяшчаем поўны тэкст пастановы парткалегіі ЦКК і заўвагі рэдакцыі «ПРАВДЫ», пераданыя ТАСС.

Месячнік ашчаднасьці павінен стаць масавай кампаніяй

Паводле пастановы прэзыдыуму ЦВК БССР, месячнік ашчаднасьці працягнуты да 15-га сакавіка. Гэта мерапрыемства выклікана тым, што заданьне на 1-га сакавіка ня выканана, што кантрольныя лічбы месячніка не ажыцьцёўлены.

У сувязі са спазьненьнем у падрыхтоўцы кампаніі на мясцох, першая дэкада была амаль зусім не скарыстана. Слаба мабілізаваны ашчадны апарат. Мелі месца недапушчальныя адносіны з боку асобных савецкіх, прафэсыйных арганізацый, як вынік недаацэнкі палітычнага і гаспадарчага значэньня кампаніі.

Значнае ажыўленьне кампаніі ўнесла ўмяшальнасьць маскоўскай рабочай брыгады і мясцовых рабочых брыгад. Ініцыятыва і настойлівасьць рабочых брыгад падцягнулі савецкую і прафэсыйную грамадзкасьць і дапамаглі разварушыць месцы. Такім чынам, кампанія па БССР фактычна пачала разгортвацца толькі з другое паловы лютага, галоўным чынам, у гарадох. Найбольш слабае месца кампаніі—вёска. У вёсцы месячнік ашчаднасьці амаль не адчуваўся. Між тым, адна з асноўных задач кампаніі — дабіцца рашучага пералому ў адносінах уцягненьня ў ашчадныя касы бядняцка - серадняцкае сялянства.

Працяг кампаніі трэба поўнасьцю вы карыстаць для таго, каб нагнаць прапушчанае. Трэба ў усёй рашучасьцю адхіліць дэмабілізацыйныя настроі ў адносінах месячніка ашчаднасьці.

Пастанова прэзыдыуму ЦВК са ўсёй выразнасьцю падкрэсьлівае адказнасьць акрвыканкомаў і райвыканкомаў за пасьпяховае правядзеньне кампаніі. Трэба, каб гэта адказнасьць адчувалася на практыцы, каб месячнік ашчаднасьці стаў масавай кампаніяй, каб заданьне па месячніку было абавязкова выканана.

СССР ПРАЗ 15 ГОД

ЗА 10 ГОД ПРАДУКЦЫЯ САВЕЦКАГА САЮЗУ ПАВЯЛІЧЫЦЦА Ў 19 РАЗ. —ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ І ТРАНСПАРТУ.--АД АГРАРНАЙ РАСІІ ДА ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА СССР. —ВЫПЕРАДЗІМ ЗАГРАНІЧНУЮ ТЭХНІКУ

Да апошняга часу праблема генэральнага пляну нашай гаспадаркі абмяркоўвалася ў вузкім коле спэцыялістых. Гэтымі днямі адзін з навейшых варыянтаў гіпотэзы генэральнага пляну быў вынесены на абмеркаваньне больш шырокага сходу, а 5 сакавіка ў Дзяржпляне разгарнуліся спрэчкі па дакладу аўтара гэтага варыянту т. Кавалеўскага.

Як будуе свой плян т. Кавалеўскі?

Дакладчык падае рад цікавых лічбовых паказальнікаў. Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі за 75 год павялічылі сваю прадукцыю ў 21 раз. Гіпотэза генэральнага пляну выпярэджвае Амэрыку. Да 1940 году, г. зн. праз 10 год, СССР павінен павялічыць сваю прадукцыю ў 19 раз, г. зн. дабіцца трайной прадукцыі сучаснай Амэрыкі.

Генэральны плян павінен грунтавацца на далейшай электрыфікацыі краю. На працягу трох пяцігодак, якія ахапляюцца генэральным плянам, прамысловасьць будзе электрыфікавана поўнасьцю, а транспарт—на 75 проц. Гэта значыць, што тры чвэрткі ўсіх цягнікоў пярэйдуць на электрычную цягу. Аўтапарк павінен быць даведзены да 20 мільёнаў легкавых, ня лічачы грузавых машын.

У галіне сельскай гаспадаркі гіпотэза т. Кавалеўскага намячае выпусьціць да 1940 году 25 мільёнаў трактароў. Зараз кошт прадукцыі сельскай гаспадаркі перавышае кошт прамысловай прадукцыі, а праз 10 год яна павінна складаць толькі 22 проц. кошту ўсіх вырабаў прамысловасьці. Гэта паказвае, наколькі генэральны плян зьменіць аблічча Саюзу шляхам перабудовы яго з краю аграрнага ў край індустрыяльны.

*

КАЛЕКТЫВІЗАВАНА 55 ПРОЦ. СЯЛЯНСКІХ ДВАРОЎ СССР

МАСКВА, 8. ПА ВЕСТКАХ НАРКАМЗЕМУ СССР, НА 1-Е САКАВІКА КАЛЕКТЫВІЗАВАНА 55 ПРОЦАНТАЎ СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРАК САВЕЦКАГА САЮЗУ. УСЯГО НА ТЭРЫТОРЫІ СССР АРГАНІЗАВАНА ЗВЫШ 110 ТЫСЯЧ КАЛГАСАЎ, ЯКІЯ АБ'ЯДНАЮЦЬ 4.264.000 СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРАК. САМЫ ВЫСОКІ ПРОЦАНТ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ДАЕ Ц. Ч. ВОБЛАСЬЦЬ — 81,8 ПРОЦ.

НАСЕНЬНЕМ КАЛГАСЫ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ ПОЎНАСЬЦЮ.

ПРАВЕРКА І ЧЫСТКА РАДОЎ УсеЛКСМ

МАСКВА, 7. Пры ЦК УсеЛКСМ сфармавана цэнтральная камісія па праверцы і чыстцы радоў УсеЛКСМ. Праверка і чыстка радоў УсеЛКСМ пачнецца пасьля IX зьезду УсеЛКСМ.

На барацьбу за прамфінплян

„Чырвоная Бярэзіна" ня вартая быць ударнай

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ НЯ ВЫКАНАНЫ

Зрыў пляновых заданьняў, рост прагулаў

Кіраўніцтва фабрыкі ня здолела стаць на чале рабочай актыўнасьці

«ЗЬВЯЗДА» ў пачатку лютага сыгналізавала аб буйнейшых гаспадарчых прарывах на фабрыцы «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА». «Зьвязда» пісала аб тым, што на фабрыцы зрываецца прамфінплян, паслабла працоўная дысцыпліна, што партыйнае і камсамольскае кіраўніцтва фабрыкі пляцецца ў хвасьце, што адміністрацыя і фабзаўком бязьдзейнічаюць і г. д., і г.д. У адказ рабочыя і работніцы «Чырвонай Бярэзіны» абвясьцілі сябе ўдарнымі і запэўнілі, што яны ў лютым ліквідуюць гаспадарчыя прарывы і выканаюць прамфінплян.

Сёньня мы канстатуем, што «Чырвоная Бярэзіна» ня выканала ўзятага абавязку і нявартая годнасьці ўдарнай фабрыкі. Сёньня мы канстатуем, што партыйнае, камсамольскае і адміністрацыйнае кіраўніцтва фабрыкі ня здолела стаць на чале рабочай актыўнасьці і павесьці рабочыя масы на барацьбу за ліквідацыю гаспадарчых прарываў.

Адміністрацыя «Чырвонай Бярэзіны» замест таго, каб ужыць усе захады да зьнішчэньня прарываў, найшла на злачынны па сутнасьці манэўр. Для таго, каб пусьціць пыл у вочы, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць, адміністрацыя самастойна, без усялякіх па тое падстаў, зьменшыла прамфінплян.

Паводле прамфінпляну «Чырвоная Бярэзіна» ў студзені і лютым павінна была выпусьціць 70.000 скрынь запалак. Адміністрацыя-ж вызначыла ў плянавым заданьні выпусьціць толькі 52.000 скрынь запалак. Па сядзеньнях замест 61.000 тузінаў, паказаных у прамфінпляне, адміністрацыя вызначыла толькі 51.000. Па ватэрпасах кантрольныя лічбы зьменшаны на 7.000 тузінаў. Гэтае зьмяншэньне кантрольных лічбаў прамфінпляну адміністрацыя зрабіла без усялякага дазволу, не паведамі́ўшы партыйных і прафэсыянальных арганізацый і рабочых мас фабрыкі.

У выніку ў лютым «прамфінплян» выкананы. Але ў сапраўднасьці «Чырвоная Бярэзіна» ня толькі не ліквідавала гаспадарчых прарываў, але яшчэ больш іх узмацніла. Фабрыка дала ганебныя паказальнікі ў выкананьні дырэктываў аб зьніжэньні сабекошту і павялічэньні прадукцыйнасьці працы. У студзені замест зьніжэньня сабекошту на 12 проц. фабрыка павялічыла сабекошт аднэй скрыні запалак на 2 кап. У лютым таксама сабекошт прадукцыі ня зьніжаны. Відавочна зьменшылася прадукцыйнасьць працы. Паводле кантрольных лічбаў кожны рабочы ў дзень павінен выпрацоўваць 1.452 каробак запалак. У лютым-жа выпуск прадукцыі на аднаго рабочага ў дзень у сярэднім ледзь дасягаў 1.390.

Прагулы ў студзені ў параўнаньні з першым кварталам вырасьлі ў два разы. У лютым ніякіх зьмен у зьмяншэньні колькасьці прагулаў па нягрунтоўных прычынах фабрыка не дабілася.

На фабрыцы катастрафічна аслабла працоўная дысцыпліна. Асобныя рабочыя прыходзяць на фабрыку п'янымі. Адзіначальле загнанае. Сацыялістычнае спаборніцтва праводзіцца толькі на паперы. Фактычна па-ўдарнаму працуе зусім нязначная невялікая група рабочых. Ні бюро парткалектыву, ні камсамольская арганізацыя фабрыкі, ні фабзаўком, ні цэхпрафбюро зусім ня кіруюць сацыялістычным спаборніцтвам. Шмат камуністых і камсамольцаў плятуцца ў хвасьце і ня прымаюць сапраўднага ўдзелу ва ўдарным руху.

Культурна - масавая і прафэсыянальная работа на фабрыцы запалала. Вытворчая камісія не працуе. За 5 месяцаў не праведзена ні аднаго рацыяналізатарскага мерапрыемства.

Партыйна - камсамольская работа ў цэху не знаходзіцца на належнай вышыні.

Так працуе фабрыка, дзе бязьдзейнічае партыйнае, камсамольскае, праф саюзнае і адміністрацыйнае кіраўніцтва.

П. КАВАЛЕЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: Зьмяшчаючы артыкул нашага карэспандэнта, рэдакцыя лічыць, што «Чырвоная Бярэзіна павінна быць пазбаўлена годнасьці ўдарнай. Трэба безадкладна аздаравіць партыйна - камсамольскае, адміністрацыйнае і прафсаюзнае кіраўніцтва фабрыкі, якое ня справілася з задачамі, пастаўленымі перад ім.

Памылковая ўстаноўка адміністрацыі заводу „Дрэвааапрацоўшчык"

Рэдакцыя атрымала апэрацыйную зводку аб працы лесапільнага цэху заводу «Дрэвааапрацоўшчык» за люты. У параўнаньні з зацьверджаным прамфінплянам лесапільны цэх выканаў вытворчыя праграмы з перавышэньнем на 10,58 проц. Але лесапільны цэх з 1 лютага перайшоў на бесьперапынны тыдзень, што павінна было павялічыць выпрацоўку на 26 проц. Такім чынам, атрымліваецца ўжо недавыпрацоўка на 15,42 проц. І вось тут адміністрацыя заводу «Дрэвааапрацоўшчык» робіць «заўвагу», што «недавыпрацоўка тлумачыцца пераходам на 7-гадзінную працу, што можа даць памяншэньне вытворчасьці прыблізна на 12,5 проц.».

Нам здаецца, што ў гэтай «заўвазе» ёсьць вялікая памылка. Для ўсіх зразумела, што пераход на 7-гадзінную працу, пры належнай падрыхтоўцы, павінен даць ня ўпад прадукцыйнасьці працы, а павышэньне. Адсюль трэба зрабіць вывад, што адміністрацыя заводу «Дрэвааапрацоўшчык» не правяла належнай падрыхтоўчай работы, калі пераход на 7-гадзінную працу паменшыў прадукцыйнасьць працы.

Мы чакаем ад заводзкіх арганізацый больш выразнага адказу на гэтае важнае пытаньне

„Чырвоны Мэталісты" ліквідуе прарыў

За першыя пяць дзён сакавіка завод „Чырвоны Мэталісты" (Віцебск) выканаў вытворчую праграму наступным чынам: па вырабе плугоў — на 108,75 проц., малатарань —на 107,5 проц., арфаў—на 105,9 проц., прывадоў —на 46,2 проц. і сячкарань—на 53,6 проц.

„Чырвоны Мэталісты" ўпарта б'ецца над выкананьнем свае асноўнае задачы — ліквідацыі прарыву першага кварталу.

Лепшы рабочы

Вагаўшчык ЖЫЛІНСКІ з заводу «ЭНЭРГІЯ». Вытворчы стаж—26 год. Норма выпрацоўкі каромыслаў да вагі —7 у дзень, ён-жа выпрацоўвае 9 з палав. у сярэднім.

Яшчэ больш узмацніць тэмпы

Завод імя ЛАНЦУЦКАГА ў Гомелі Ў ЛЮТЫМ дабіўся значных посьпехаў у выкананьні вытворчае праграмы: па рамонце паравозаў праграма выканана на 100 проц., па капітальным рамонце клясных вагонаў — НА 200 ПРОЦ., па сярэднім рамонце клясных вагонаў—на 120 проц., па гадавым агляздзе клясных вагонаў—на 114 проц. Але, калі ўлічыць, што ў першым квартале завод праграмы недавыканаў, дык на 1 сакавіка праграма за 5 месяцаў будзе выканана толькі НА 93 ПРОЦ.

У якасных паказальніках ёсьць таксама значнае паляпшэньне, але нормы НКШЗ НЕ ДАСЯГНУТЫ. Норма рамонту паравоза—18 дзён, фактычна паравозы рамантуюцца заводам 22,8 дня. Норма па сярэднім рамонце клясных вагонаў—18 дзён, фактычна — 24,6 дня. Толькі па капітальным рамонце клясных вагонаў дасягнута норма НКЗШ—26,6 дня. Усё-ж у параўнаньні з першым квартапам прастой паравозаў ПАМЕНШЫЎСЯ на 35 проц., клясных вагонаў—на 30 проц., па капітальным рамонце і 7 проц. па сярэднім рамонце.

Для 100 - процантнага выкананьня прамфінпляну трэба не паслабляць узятага тэмпу, а наадварот—МАКСЫМАЛЬНА ЯГО ЎЗМАЦНІЦЬ.

БАРТАШЭВІЧ.

ЗНАЧНАЕ ПАЛЯПШЭНЬНЕ НА ГАЛЯНТАРЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ

Галянтарэйная фабрыка «БЕЛАРУСКА» выканала вытворчую праграму за студзень толькі на 61,5 проц. Мабілізацыя ўвагі рабочых і работніц фабрыкі вакол гэтага пытаньня дапамагла Ў ЛЮТЫМ адразу-ж ліквідаваць прарыў. За люты вытворчая праграма выканана на 108,5 проц., гэта значыць праграма ПЕРАВЫКАНАНА.

Зрэзумела, што гэта не павінна супакоіць фабрычныя арганізацыі. Д.

Міністэрства ўнутспраў Польшчы на чале антысавецкай кампаніі

Афіцыёзнае польскае агенцтва абараняе легенду аб бежанцах з СССР

ВАРШАВА, 6. Антысавецкая кампанія, якая ўжо была заціхла, навокал нібы масавага ўцяканьня ў Польшчу сялян, каторыя нібы-та супраціўляліся паліцыцы калектывізацыі, зноў аднавілася. Агенцтва пілсудчыкаў «Іскра», апублікавала сёньня ў газэце паведамленьне, у якім гаворыцца: «Пытаньнем аб бежанцах з СССР сур'ёзна зацікавіўся папа, прадстаўнік якога ў Варшаве прыняў удзел у нарадзе з прадстаўнікамі польскага міністэрства ўнутраных спраў і заявіў ад імя Ватыкану аб гатоўнасьці папы прысьці на дапамогу польскаму ўраду ў справе арганізацыі канцэнтрацыйных лягераў і карантынаў для ўцякаючых з СССР сялян».

Агенцтва прымушана, аднак, прызнаць, што да гэтага часу ўцекачы маюцца ў невялікай колькасьці і тут-жа зазначае, што, калі калектывізацыя ў СССР будзе адбывацца далей, Польшчы цяжка будзе ўзяць на сябе ўсе выдаткі на ўтрыманьні ўцекачоў. Пакуль-жа, моў, улады выбіраюць месцы для канцэнтрацыйных лягераў. Для арганізацыі гэтых лягераў, наводле слоў «Іскры», патрэбна дапамога заграніцы. Нансэнаўскі камітэт і прадстаўнік папы запрапанавалі ўжо свае паслугі ў гэтых адносінах.

Выступленьне афіцыёзнага агенцтва, якое прымае на сябе ролю пачынальніка новага антысавецкага цкаваньня — гэта не адзінкавае зьявішча. Гэта адна з антысавецкіх інтрыг, якія павялічваюцца з кожным днём. Варшаўскі арцыбіскуп Какоўскі распарадзіўся, каб ва ўсіх касьцёлах адбываліся набажэнствы за «прасьледуемых у СССР веруючых». Арцыбіскуп прапануе, каб замест казаньняў у касьцёлах чыталася вядомае папскае пісьмо. Апрача таго, ён заклікае веруючых арганізоўваць сходы з мэтаю выяўленьня небясьпекі камунізму і вынясеньня рэзалюцый пратэсту для перадачы іх міністэрству замежных спраў. Фашысцкая арганізацыя «Сокал» таксама заклікала сваіх членаў арганізаваць антысавецкія малебствы. На 7-га сакавіка склікаецца антыкамуністычны мітынг пратэсту ў адным з найбольшых варшаўскіх памяшканьняў.

Выступленьне агенцтва пілсудчыкаў «Іскра» з антысавецкай дэкларацыяй, парада ў міністэрстве ўнутраных спраў з удзелам папскага нунцыя аб «дапамозе пераходзячым на тэрыторыю Польшчы ўцекачом з савецкай тэрыторыі», сваяасаблівы ўдзел міністра ўнутраных спраў Юзэфскага сумесна з прадстаўніком генэральнага штабу на набажэнстве ў памяць расстраляных 10 год таму назад (у часе вайны Польшчы з СССР) членаў польскай нелегальнай вайсковай арганізацыі ПОВ (якая адыгрывала ў СССР ролю звычайнай шпіёнскай арганізацыі), аб чым паведамляе сёньнішні друк, — усё гэта сьведчыць аб тым, што міністэрства ўнутраных спраў пасьля некаторых хістаньняў цьвёрда парашыла ўзяць у свае рукі, на сваю адказнасьць, разьюшаную антысавецкую кампанію. Нунцы Мармаджы паведаў прэм'ера Бартэля. Як падаюць газэты, візыт нунцыя зьвязаны з пытаньнем аб уцекачох з СССР. У горадзе расклейваюцца адозвы антыбальшавіцкай лігі, у якой аршыннымі літарамі пішацца аб савецкім краі ў самых агідных і хуліганскіх выразах.

На рашучую барацьбу з „нэйтральнасьцю"

Усе сілы інжынэрна-тэхнічных работнікаў на выкананьне пяцігодкі

(З рэзалюцыі, прынятай агульна-гарадзкім сходам інжынэрна-тэхнічных і навуковых работнікаў 6 сакавіка 1930 г. па дакладу тав. ГАЛАДЗЕДА)

У той час, — гаворыцца ў рэзалюцыі, — калі лепшая частка інжынэрна-тэхнічных работнікаў і навуковых працаўнікоў разам з рабочаю клясаю і ўсімі працоўнымі аддана працуе над сацыялістычнай рэканструкцыяй нашай краіны, шкоднікі падкладваюць міны з імкненьнем сарваць нашае сацыялістычнае будаўніцтва і дапамагчы зьлейшым ворагам СССР у іх спробах перашкодзіць выкананьню пяцігодкі і тым самым палегчыць рэстаўрацыю капіталізму.

Побач з гэтымі двума выразна выяўленымі лягерамі ў асяродзішчы інжынэрна-тэхнічных сіл і навуковых працаўнікоў ёсьць яшчэ маса так званых «нэйтральных», якія аб'ектыўна дапамагаюць шкоднікам рабіць сваю контррэвалюцыйную справу.

Ад імя 1.200 інжынэрна-тэхнічных і навуковых працаўнікоў гор. Менску мы заяўляем:

— Контр-рэвалюцыйным шкоднікам няма месца ў нашых радох. Іх месца на лаўцы падсудных пралетарскага суду. Рашучая і бязьлітасная барацьба з «балотам», «нэйтральнасьцю», якая аб'ектыўна грае на руку контр-рэвалюцыі, згуртаваньне сумленных, адданых справе сацыялістычнага будаўніцтва, працаўнікоў для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, хутчэйшае і больш поўнае насычэньне інжынэрна-тэхнічных сіл і навуковых працаўнікоў новымі пралетарскімі кадрамі, — вось асноўныя задачы інжынэрна-тэхнічных і навуковых працаўнікоў.

Час перайсьці ўжо ад слоў і дэкларацый да справы. Сацыялістычнае спаборніцтва сярод інжынэрна-тэхнічных і навуковых працаўнікоў павінна быць шырока разгорнута і накіравана на ліквідацыю прарываў у выкананьні прамфінплянаў, на тэхнічнае ўзбраеньне пралетарыяту, на выпрацоўку агранамічна пісьменных калгасьнікаў і саўгасьнікаў, на ўсямерную і ўсебаковую тэхнічную, агранамічную, культурную, мэдычную і інш. дапамогу ў правядзеньні надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі.

Толькі выкананьне гэтых задач можа зьявіцца паказальнікам таго, наколькі маса інжынэрна-тэхнічных і навуковых працаўнікоў на справе, а ня толькі на словах, бярэцца за ачышчэньне сваіх радоў ад шкоднікаў, бярэцца за палітычнае перавыхаваньне, за ліквідацыю «нэйтральнасьці», за згуртаваньне лепшых, адданых справе сацыялізму, працаўнікоў.

За справу пралетарыяту, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, — у паход за хутчэйшае ажыцьцяўленьне вялікага пляну пабудовы сацыялізму ў нашай краіне.

6-га сакавіка ў краёх белага тэрору

Крывавыя сутычкі з паліцыяй ва ўсіх прамысловых гарадох Чэха-Славакіі

ПРАГА, 7. Паступаюць усё новыя весткі аб ходзе ўчарашняй дэманстрацыі беспрацоўных. Рабочыя заводу Шкода ў Пільзені наладзілі вялікую дэманстрацыю, якая закончылася радам арыштаў. Сярод арыштаваных камдэпутат Дворжак.

У Масо паліцыя разагнала дэманстраваўшых гарнякоў штыкамі. Арыштаваны камуністычны сэнатар Стрэнскі.

У Брно адбылося 6 мітынгаў. Па гораду прайшло 6.000 дэманстрантаў з воклічамі: «Хлеба і работы», «Дайце рабочым кватэры», «Няхай жыве СССР», «Далоў фашысцкі ўрад» і інш.

У Басковіцах, недалёка ад Брно, дэманстравала 3.000 рабочых.

У Брацісляве (галоўны горад Славакіі) адбылося тры мітынгі. Мітынгі былі разагнаны паліцыяй. Арыштавана некалькі рабочых, у тым ліку камдэпутат Штэйнэр. Дэманстрацыі адбыліся таксама ў іншых гарадох Славакіі і Маравіі.

У выніку сутычак паміж рабочымі і жандарамі шмат дэманстрантаў паранена і 24 чал. арыштавана.

Беспрацоўныя Вены вышлі на вуліцы

ПАРЫЖ БЫЎ АБЕРНУТЫ Ў ВАЕННЫ ЛЯГЕР

Ва ўсіх буйных гарадох Чэха-Славакіі адбываліся крывавыя сутычкі з паліцыяй

ЗАБАСТОЎКІ САЛІДАРНАСЬЦІ Ў ПАРЫЖЫ

УСЯ ПАЛІЦЫЯ І ФАШЫСЦКІЯ АТРАДЫ БЫЛІ ПАСТАЎЛЕНЫ НА НОГІ

НАД ГОРАДАМ ПАТРУЛЯВАЛІ ПАЛІЦЭЙСКІЯ САМАЛЁТЫ

ПАРЫЖ. 6 сакавіка прашло ў абставінах выключных паліцэйскіх мераў. Буйныя заводы былі акружаны шматлікімі атрадамі паліцыі і жандармэрыі. Аднак, тысячы парыскіх будаўнікоў, занятых на пабудове дамоў, арганізавана спынілі работу з поўдня. Каля паловы шофэраў таксі, г. зн. ня менш 8000 чалавек, баставалі ў пасьляабедзеныя гадзіны. У доме ўнітарных прафсаюзаў, акружаным сотнямі паліцэйскіх, сабраўся 3.000 мітынг будаўнікоў. На радзе вялікіх прадпрыемстваў праводзяцца італьянскія забастоўкі, перарываюцца работы канвэераў і арганізуюцца сходы цэхаў. Арыштавана некалькі рабочых, якія расклейвалі адозвы. На вялікіх аўтамабільных заводах, ня гледзячы на згуртаваньне нябывала вялікіх сіл паліцыі, у абедзены перапынак, а таксама пры выхадзе з работы, якая ў радзе выпадкаў спынялася раней тэрміну, былі праведзены лятучыя мітынгі.

Для выкананьня данай урадам дырэктывы аб «падтрыманьні добрага парадку ў дзень 6 сакавіка» была паднята на ногі ня толькі ўся парыская паліцыя, але і муніцыпальная гвардыя. Як паведамляюць газэты, з правінцыі былі перакінуты ў Парыж шматтысячныя атрады пешай і коннай рэспубліканскае гвардыі, спэцыяльна прыстасаванай для задушэньня рэвалюцыйных выступленьняў, а таксама шматлікія атрады рэспубліканскае гвардыі. Узброеная сіла, якая налічвалася дзесяткамі тысяч, была згуртавана як вакол буйных заводаў, так і ў цэнтры гораду, а таксама ва ўсіх прамысловых прыгарадах Парыжу, якія французкая прэса прывыкла называць «чырвоным пасам вакол Парыжа», словам, ва ўсіх тых пунктах гораду, якія паліцыя расцаніла як стратэгічныя цэнтры. Над горадам і прыгарадам патрулявалі паліцэйскія аэрапляны для сыгналізаваньня аб зборы рабочых. «Стратэгічныя цэнтры» ў горадзе былі зьвязаны паміж сабою перасоўнымі паліцэйскімі радыё-станцыямі.

***

ПАРЫЖ, 7. Першыя весткі аб 6 сакавіка, якія паступаюць з правінцыі, сьведчаць аб тым, што ў радзе прамысловых цэнтраў Францыі ўчора адбыліся вялізарныя выступленьні рабочых пад лёзунгамі французкае кампартыі і унітарнай канфэдэрацыі працы.

ПАЛІЦЫЯ І ВОЙСКІ Ў БАЯВОЙ ГАТОЎНАСЬЦІ

ВЕНА, 6. У Бухарэсьце і ва ўсіх правінцыяльных цэнтрах Румыніі паліцыя і войска 6-га сакавіка былі ў баявой гатоўнасьці. Ужо 5-га сакавіка ў Бухарэсьце, Кішаневе, Галацы, Тэмэшвары, Чарнавіцах і Лупэнах зроблены вобыскі і шматлікія арышты ў рабочых раёнах. (ТАСС).

АДЗІНЫ ФРОНТ ЛАТВІЙСКІХ САЦЫЯЛ-ФАШЫСТЫХ З РЭАКЦЫЯЙ СУПРОЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ

РЫГА, 7. Незадоўга да міжнароднага дня барацьбы з беспрацоўем на радзе фабрык Рыгі, Дзьвінска і Лібавы адбыліся лятучыя мітынгі, якія праходзілі пад лёзунгам салідарнасьці рабочых з беспрацоўнымі. У вялікай колькасьці распаўсюджваліся адозвы, прысьвечаныя міжнароднаму дню. Сацыял-дэмакраты дзейнічалі адзіным фронтам з рэакцыйным урадам і белагвардзейскімі, папоўскімі і манархічнымі расійскімі коламі.

Дэманстрацыі ў Швэцыі працягваліся да позьняга вечара

У СУТЫЧКАХ З ПАЛІЦЫЯЙ ПАРАНЕНЫ ДЗЕСЯТКІ РАБОЧЫХ

СТАКГОЛЬМ, 7. Выступленьні стакгольмскіх рабочых у міжнародны дзень барацьбы з беспрацоўем зацягнуліся да позьняга вечара. На трох пляцох Стакгольму адбыліся мітынгі, якія сабралі каля 3.000 удзельнікаў. Уся паліцыя была мабілізавана для папярэджаньня магчымасьці злучэньня удзельнікаў асобных мітынгаў у агульную дэманстрацыю.

З вялікім посьпехам прайшлі дэманстрацыі ў дзень 6-га сакавіка ў правінцыі. Самая буйная дэманстрацыя адбылася ў Гётэборгу, дзе выступіла 5.000 рабочых. На дэманстрацыю зьявіліся калектывы рабочых некалькіх заводаў у поўным складзе. Буйныя дэманстрацыі адбыліся ў радзе іншых гарадоў Швэцыі. Усюды былі прыняты рэзалюцыі, дзе ўхваляюць барацьбу, якую вядзе камуністычная партыя за інтарэсы беспрацоўных. Орган ЦК швэдзкай кампартыі «Ню-Дан» адзначае, што дэманстрацыі 6-га сакавіка з большым посьпехам прайшлі ў буйных індустрыяльных цэнтрах Швэцыі—у Гётэборгу, Мальме, Бэргэлі.

Выселеныя з кватэр 4 сям'і беспрацоўных месьцяцца пад плотам. (Здымак зроблен у Варшаве, Паўя вул. 72).

Новы сакратар Фрунзаўскага РК КП(б)Б

Учора адбыўся пашыраны пленум Фрунзаўскага райкому партыі. Пленум заслухаў паведамленьне т. Славінскага аб адазваньні т. Гурэвіча у распарадженьне ЦК КП(б)Б на адказную партыйную работу у Гомель. Новым сакратаром райкому абраны т. Шпэнтараў.

На 10 сакавіка г. г. скликаецца

пленум ЦКК КП(б)Б

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад Полацкай АКК (дакладчык т. Эгле, судакладчык т. Калнін)
2. Аб масавай рабоце ЦКК-РСІ (дакл. т. Лазоўскі).
3) Вынікі чысткі савецкага апарату па трох Наркаматах—НКЗ, Наркамфін і Наркамюст—і далейшы плян чысткі савецкага апарату (дакл. т. Рыскін)
4. Рознае.

Яўка ўсіх членаў ЦКК абавязкова.

АБ ГАЗЭЦЕ „ПРАФРУХ"

ЦСПСБ і рэдакцыя газэты «Зьвязда» паведамляюць, што выпуск штотыднёвага дадатку да газэты «Зьвязда»—«ПРАФРУХ» затрымаўся па тэхнічных прычынах. Бліжэйшымі днямі выйдзе чарговы нумар «Прафруху», пасьля якога будзе наладжаны рэгулярны выпуск яго.

М. ГАЛАДЗЕД

ПАЛІТЫКА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ВЁСЦЫ І ЗАДАЧЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

(Даклад на ўсебеларускай канфэрэнцыі батрацка-бядняцкіх груп))*

Мы давалі дырэктыву, што пры раскулачваньні трэба абгаворваць сьпісы кулакоў на сходах беднаты, у групах бедноты, галасаваць па прозьвішчу. Вам больш на месцы павінна быць відно, ці зьяўляецца ён кулаком, ці зьяўляецца ён серадняком. Вы больш, чым хто, павінны дапамагаць у гэтым нашым органам партыі на вёсцы і сельсаветам. А ў радзе выпадкаў мы мелі такія зьявішчы—сабралі сход і прынялі агульную рэзалюцыю «раскулачыць кулакоў» і толькі. Часта вы чакалі, каб вам кулака паказаў хто-небудзь з сельсаветчыкаў, брыгадзіраў ці з ячэйкі. Вы павінны быць зачынішчыкамі ў выцяненьні кулакоў, вы павінны быць зачынішчыкамі ў выцяненьні тых кулакоў, якія ад нас выкруціліся, вы павінны быць зачынішчыкамі выпрацьленьня і тых выпадкаў, калі закранаецца серадняк.

Беднякі і батракі, вы таксама павінны ўзяць на сябе адказнасьць за гэту работу. Не забывайцеся, што і вы ў такой-жа меры несяце адказнасьць, як і мы. Мы лічым вас вернымі памочнікамі ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзіць партыя і савецкая ўлада такім чынам, і вы зьяўляецеся такімі-ж адказчыкамі за тую работу, якую мы праводзім.

Няма чаго гаварыць, што пытаньне аб калектывізацыі ў радзе месц было няправільна растлумачана. Я аб'ездзіў дзе сяткі глухіх вёсак і калгасаў. Я ўпэўніўся, што ў радзе месц пашы органы нясур'ёзна падыходзілі да справы калектывізацыі.

Там, дзе сур'ёзна праводзілі працу з беднатой, арганізавалі яе, там, дзе правільна растлумачылі сярод бядняцка-серадняцкага сялянства задачы калгаснага будаўніцтва, там, дзе глыбока і добра праведзена падрыхтоўчая палітычная праца, там мы маем даволі моцную калектыўную базу, там калгас устойлівы і моцны. Такіх калгасаў у нас многа, асабліва ў Клімаўшчыне. Я быў у калгасах Клімаўшчыны, там ня так даўно арганізаваліся калгасы, але там цалкам абагулены інвэнтар, гаспадарчыя пабудовы, цягавая сіла і коровы. І паспрабуйце вы там сказаць любому калгасьніку, што патрэбна выйсьці з калгасу і забраць карову, дык вы, як правіла, можаце наляпець на такога калгасьніка, які вам пакажа на дзьверы і пашле за такую параду, падалей, як кажуць. Вось што значыць сур'ёзна падысьці да калектывізацыі.

Я быў ва многіх калгасах Калінінчыны, якія ў розныя часы арганізаваліся і ў розных па аб'емах, я ўзяў для прыкладу ня толькі лепшыя, але і горшыя. Там сапраўды праведзена сур'ёзная падрыхтоўка працы. Там сапраўды ёсьць кадры актыўных беднякоў і батракоў і там справа калектывізацыі абставіць добра. Там сёньня не стаіць пытаньне аб тым, што калгас распадзецца, і аб тым, што калгас—на паперы, там вельмі мала было выпадкаў, калі награжалі прыняць рэпрасыўныя меры за тое, што ня пойдзе селянін бядняк ці серадняк у калгас. Таму, што сялянне ў асноўным правільна зразумелі выгаду і перавагу калгаснага будаўніцтва, зразумелі выгаду працы ў калгасах.

Там правільна падышлі, растлумачылі, сур'ёзна паставілі справу. Але я ведаю і іншыя выпадкі з другіх раёнаў. Там, дзе ня было ніякай падрыхтоўчай працы, там ёсьць скрыўленьне нашай генэральнай лініі. Вось прыклад: у адным калгасе праводзілі абагуленьне насеньня. Абагульвалі насеньне і тых сялян, якія ішчэ пакуль што ня ўступілі ў калгас. І замест таго, каб сур'ёзна павесьці работу па калектывізацыі ішчэ не калектывізаваных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, нашы працаўнікі вынесьлі пастанову самую лёгкую: «тых сялян, якія здалі насеньне ў калгас, лічыць членамі калгасу». На падставе гэтага брыгадзіры на наступны дзень ідуць да гэтых сялян за абагульненьнем жывёлы. Гэта ўпае скажэньне лініі партыі. Нельга так ставіць пытаньне, што той, хто ссыпаў насеньне, лічыцца калгасьнікам. Нельга так ставіць пытаньне, трэба ўпэўніць селяніна ў неабходнасьці калектывізацыі, каб ён запісаўся ў калгас, напісаў-бы сам аб гэтым заяву. У другім калгасе пры абагуленьні жывёлы, напрыклад, кароў, наступаюць так, што за каровай калгасьніка для абагуленьня ідуць брыгадзіры ў пуню, а трэба рабіць так, каб не брыгадзіры ішлі за кароваямі калгасьнікаў, а патрэбна, каб калгасьнік сам вёў карову для абагуленьня. Неабходна, каб калгасьнік сам зразумеў неабходнасьць абагуленьня сродкаў вытворчасьці і жывёлы. А для гэтага трэба сур'ёзна і глыбока папрацаваць. Калі гэтага няма, то гэта значыць, што ў такіх выпадках па сутнасьці папяровая калектывізацыя.

Таварышы, я ня буду прыводзіць шматлікіх прыкладаў, я толькі хачу сказаць, што ўстаноўка нашай партыі, устаноўка савецкага ўраду на тое, што калектывізацыя павінна грунтавацца на добраахвотных пачатках, не на адміністраваньні, на добраахвотнасьці ў выніку правядзеньня глыбокай папярэдняй палітычнай падрыхтоўкі працы — гэта асноўная ўстаноўка партыі і савецкае ўлады, якое многія таварышы не разумеюць і таму скрыўляюць лінію нашай партыі.

Толькі на падставе добраахвотнасьці можа быць моцная, а не папяровая калектывізацыя. Акрамя таго да пераглядзу трэба адносіці і такія пытаньні, калі ішчэ не пасьпеюць аформіць калгас, а ўжо імкнуцца абагуліць ня толькі асноўныя сродкі вытворчасьці, цягавую сілу і рагатую жывёлу, а адразу бяруцца абагульваць і курэй, і авечак, і парасят. Гэта — глупства, нельга гэтага рабіць.

Наша задача, паскольку мы арганізоўваем у сваёй абсалютнай большасьці арцелі, г. зн. тыпы калгасу ў нас будуюцца на ўзроўні арцелі, то мы павінны асноўную ўвагу зварачаць на сродкі вытворчасьці і асноўныя віды жывёлы, якія падлягаюць абагуленьню. Такімі сродкамі вытворчасьці зьяўляюцца сельска-гаспадарчы інвэнтар, с.-гаспадарчыя пабудовы, цягавая сіла (коні) і рагатая прадукцыйная жывёла.

Бюро ЦК КП(б)Б вынесла пастанову і мы яе аформім у савецкім парадку, аб тым, каб асноўнай задачай пры абагуленьні сродкаў вытворчасьці было абагуленьне інвэнтару, пабудоў, цягавай сілы, і мы паранылі, як правіла, абагульваць і кароў, але ў залежнасьці ад мясцовых ўмоў у тым ці іншым калгасе, дапускаць накіданьне адной каровы у індыдуальнае карыстаньне і зусім не абагульваць сьвіней, авечак і птушак.

Чаму мы сталі на такі шлях? Таму, што наша задача заключаецца ў тым, што пры калектывізацыі мы павінны падымаць прадукцыйнасьць сельскай гаспадаркі і падымаць прадукцыйнасьць жывёлы, каб яна хутчэй разьвівалася, а не скарачалася. А мы-ж ведаем, што без належнай падрыхтоўкі да абагуленьня жывёлы, асабліва дробнай жывёлы, мы можам мець недахопы. Гэта важна асабліва на даным этапе калгаснага будаўніцтва. Справа абагуленьня жывёлы павінна быць сур'ёзна падрыхтавана. Наша задача — каб у калгасных гаспадарках абагуленая скаціна была дагледжана лепш, чым у індывідуальнай гаспадарцы, каб яна давала лепшую і большую прадукцыю, чым у індывідуальных гаспадарках, а ў радзе выпадкаў не здавальняе гэтым запатрабаваньням кепска падрыхтаванае абагуленьне жывёлы у новых калгасных гаспадарках, у радзе выпадкаў некаторыя таварышы не паклапаціліся аб арганізацыі кармавое базы.

Таму нашай задачай зьяўляецца сканцэнтраваць увагу на важнейшых сродках вытворчасьці ў калгасах і добра падрыхтаваць умовы для абагуленьня жывёлы: коняй, кароў, а сьвіней, авец і птушак ня трэба абагульваць, ды дзе будуць складаныя ўмовы, то і па аднэй карове можна пакінуць у індывідуальным карыстаньні. Пры гэтым ніякай бяды ня будзе, калі нават праз год ці больш абагуліце іншую дробязь, а цэлер той ці іншы калгасьнік будзе ў сябе трымаць ня толькі парсючка, а і добрага кабана, нахай корміць і гадуе. Ад гэтага калгас таксама нічога ня страціць, а толькі выйграе.

АБАГУЛІЦЬ СРОДКІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

Потым часта на мясцох некаторыя «порсткія» таварышы ня лічацца з тым, што ня ўсе сяляне, асабліва сялянкі могуць за адзін раз, адным махам рукі цалкам на ўсе 100 проц. адмовіцца ад уласьніцкай псыхалёгіі, — расквітацца адразу і з каровай, і з курыцай.

Што-ж вы думаеце, псыхалёгію селяніна, якая фармавалася вякамі, можна зьмяніць за адзін тыдзень, можна сёньня запісаць яго ў калгас, заўтра абагуліць усю жывёлу да апошняй курыцы. Гэтага-ж быць ня можа, дый каму трэба ўсіх курэй зганяць у адзін хлеў, калі ў тым ці іншым выпадку абагуленьне курэй ці сьвіней можа расхістаць учора з'арганізаваны калгас. Навошта гэта рабіць, калі нам трэба, каб калгасы ўзмацніліся. Нам трэба асноўнага дабіцца: абагульваць сродкі вытворчасьці, коняй, як цягавую сілу, і кароў (калі гаспадарка мае больш за адну карову то пакідаецца адна карова ў індывідуальным карыстаньні, а рэшта абагульваецца), а дробная жывёла (сьвіньні, авечкі, птушка і г. д.) няхай застаецца ня можа застацца так, каб ён нічога свайго не карміць. Яна сотнямі галоў прызвычаілася кармінь хоць дрэннага, маленькага, але свайго парсючка і курыцу, ну, і няхай корміць да таго часу, пакуль, пажыўшы ў калгасе, ня ўпэўніцца ў тым, што можна ішчэ лепшых курэй і сьвіней разводзіць і карміць у калгасе абагуленых. Патрэбна толькі дабіцца таго, каб калгасьнік, які індывідуальна карыстаецца сваёй дробнай жывёлай, каб ён добра даглядаў гэту жывёлу, каб ён не разбазарваў яе, а разводзіў-бы ішчэ больш, кантрактаваў-бы яе і т. д.

Вось наша задача, і па гэтай лініі мы далі дырэктыву. Трэба, каб на мясцох гэта зразумелі, сур'ёзна зразумелі, бо часта, як кажуць, «камнем преткновения» зьяўляецца імённа абагуленьне дробнай жывёлы. Многія сяляне згодны абагуліць коняй і кароў, а дробную жывёлу не згаджаюцца, ну, і няхай, яна ў іх застаецца.

С.-Г. АРЦЕЛЬ—АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО НА ДАНЫМ ЭТАПЕ

Я ішчэ хацеў коратка спыніцца на пытаньні афармленьня калгасаў. Тут асноўная ваша ўвага павінна быць зьвернута на тое, каб вы на мясцох самі ведалі, што вы арганізуеце, якую ступень калгасаў? Многія нашы савецкія работнікі ня ведаюць, што яны арганізуюць, многія і з вас беднякоў ня ведаюць, што арганізуюць — камуну, арцель ці таварыства на апрацоўцы зямлі. А раз сам прадстаўнік калгасазазу, ці прадстаўнік сельсавету або ячэйкі, раз прадстаўнікі райкому і РВК самі добра ня ведаюць, што арганізуюць, то што-ж вы раскажаце селянам, бо для кожнай ступені калгасу ёсьць свой розны парадак абагуленьня праны, сродкаў вытворчасьці, жывёлы і інш.

Я сустракаўся з такімі зьявішчамі што прыяжджае той ці іншы таварыш і гаворыць, што «ў нас няма калгасаў, а ёсьць усё камуны, бо ў нас сялянства нарашыла адразу арганізаваць камуну». Я кажу, ну і добра, што арганізавалі адразу камуну, пакажэце ваш статут, які вы прынялі. Паглядзеў статут і аказалася, што гэта статут арцелі, які яны прынялі. Ну, дык якая-ж у вас камуна калі вы на справе арцель стварылі, навошта-ж вы і нас і сябе ашукваеце. Арганізавалі арцель і добра, але ня трэба тое, што многія ня ведаюць, што гэта арцель, а не камуна.

Для камуны ёсьць свой статут, паводле якога абагульваюцца і сродкі вытворчасьці і сродкі спажываньня. А некаторыя даюць нам весткі, што раён калектывізавалі ўжо на 100 проц., а на самой справе палова яго калгасаў ішчэ ніякага статуту не прыняла. Вось вам і афармленьне калгасаў.

Усе нізавыя работнікі, усе беднякі якія зьяўляюцца пачынальнікамі арганізацыі калгасаў, калі-б яны ўсе добра ведалі статуты, калі-б яны маглі правільна растлумачыць серадняку, што такое с.-г. арцель, што такое камуна дык тады ня было-б і тэй мітусьні з абагульваньнем жывёлы, якую ў радзе выпадкаў у нас дапускаюць. У нас бывае так, што склікалі агульны сход, з'агітавалі яго, прагаласавалі, абвясьцілі сябе калгасам і даюць аб гэтым заметку ў газэце, а на самой справе, на гэтым сходзе была толькі палова ўсіх сялян, а вы ўжо абвясьцілі сябе калгасьнікамі і бубніце на ўсім Савецкім Саюзе, што ў вас вырас калгас на стальких і стальких тысячах гэктараў, а калі справа даходзіць да абагуленьня сродкаў вытворчасьці, дык тыя сяляне, якія ня былі на сходзе і нічога ня ведалі аб гэтым, гавораць, што яны не запісваліся ў калгас і чаго да іх чапляюцца. Такім чынам, атрымліваецца нейкі папяровы калгас.

Пры арганізацыі калгасу перш за ўсё трэба прыняць статут. І калі вы арганізуецеся, то вы павінны ведаць, што вы арганізуеце: сельска - гаспадарчае таварыства, арцель ці камуну.

У нас Цэнтральны Камітэт партыі Беларусі пастанавіў прызнаць асноўнай формай калгасаў сельска - гаспадарчую арцель, як найбольш выгодную і ўжытную форму ў нашых умовах. І вось вы павінны вывучыць на зубок статут сельска - гаспадарчай арцелі. А калі вы яго ня вывучыце, дык вы будзеце самі блытацца і другіх будзеце блытаць, якаднаго прахвоста ў нас у калгасе не засталося. Вы павінны прэстыж трымаць высока. Вы, таварышы, думаеце, што тыя працоўныя сяляне, якія сёньня пакуль што ня хочуць ісьці ў калгас, дык яны і ня пойдуць? Не, яны ўсё роўна праз паўгода, ці год прыдуць да вас прасіцца, каб іх прынялі. Мы бачылі ў радзе месц такія прыклады, калі бядняцка - серадняцкія масы, якія агітаваліся супроць калгасаў, сёньня ўжо просяцца ў калгасы. **Вы так павінны паставіць спрэву, каб сапраўды ў вас усё было добраахвотна.** Каб на добраахвотных пачатках прымаліся тыя ці іншыя сяляне ў калгасы, якія нам патрэбны, а ўсе элементы, што выклікаюць сумненьні, каб заставаліся за межамі калгасаў, тады будзе калгас здаровым, ён зможа тады з посьпехам падняць сваю гаспадарку.

ЛІКВІДАЦЫЯ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСЫ,—УДАР ПА СУСЬВЕТНАЙ БУРЖУАЗІІ

Я, таварышы, хачу ішчэ спыніцца на пытаньні аб клясавай барацьбе ў нашай краіне і аб мерах міжнароднай буржуазіі. Вы, таварышы, ведаеце з газэт, што ўсе капіталістычныя дзяржавы, уся буржуазія стараюцца тыя працэсы сацыялістычнага будаўніцтва, якія ў нас праходзяць, асьвятляць перад рабочымі ўсяго сьвету пасвойму. Яны ўсялякімі спосабамі ўзводзяць на нас хлусьню і ўсімі мерамі стараюцца заступіцца за кулака, якога мы ліквідуем, як клясу. Ці варта панамінаць вам пра гэта, вы павінны былі самі прачытаць, што зараз робіцца ў радзе капіталістычных дзяржаў. Тыя адкілы былое расійскае буржуазіі, якія нашым пралетарыятам і працоўным сялянствам выкінуты ў часе Кастрычніцкай рэвалюцыі за межы пралетарскай дзяржавы, яны таксама пачынаюць актывізавацца дзеля таго, каб умяшацца ва ўнутраныя справы Савецкага Саюзу.

Нядаўна Керанскі зварачаўся да французкай буржуазіі праз яе парлямант з тым, каб яна ўмяшалася ў нашы ўнутраныя справы, малюючы раскулачваньне і арганізацыю калгасаў так, што, быццам, савецкая ўлада робіць паход на сялянства. Ясна, што яны вакол гэтага мабілізуюць увагу ўсёй буржуазіі, увагу ўсяго капіталістычнага сьвету, мабілізуюць і ўсё духавенства на барацьбу з намі, на зрыў тых сацыялістычна-эканамічных дасягненьняў, якія праходзяць у нашай дзяржаве.

Вы ведаеце, што нядаўна папа рымскі апублікаваў таксама адозву з просьбай умяшацца ва ўнутраныя справы нашага Саюзу, а тае прычыны, што быццам у нас, у Савецкім Саюзе, ёсьць ганеньне на рэлігію. Па ўсіх капіталістычных дзяржавах зараз вядзецца міжнароднае цкаваньне Савецкага Саюзу, усюды патрабуюць умяшаньня ва ўнутраныя справы.

МІЖНАРОДНАЯ БУРЖУАЗІЯ ХОЧА ПЕРАШКОДЗІЦЬ НАШАМУ БУДАЎНІЦТВУ

Кулакі таксама імкнуцца ўвайсьці ў кантакт з міжнароднай буржуазіяй. Мы маем выпадкі, калі паасобныя агенты польскай контр-разьведкі праходзяць праз мяжу ў Савецкую Беларусь і стараюцца зьвязацца з кулацкімі элемэнтамі для разбурэньня паасобных калгасаў а сярэдзіны.

Гэтыя контр-разьведчыкі і кулакі прабуюць падбухторваць сялян, беднату і батракоў, каб не абагульваць сродкаў вытворчасьці, жывёлы і г. д., пачакаць да вясны, бо вясною будзе вайна і тады калгасы не патрэбны будуць. Яны вайною стараюцца запалохаць нашае бядняцка - серадняцкае насельніцтва.

Гэтыя кулацкія контр-рэвалюцыйныя элемэнты ўсякімі спосабамі стараюцца падарваць нашу работу. Замежная буржуазія стараецца разладзіць з намі ўзаемаадносіны. Больш за ўсіх дасягнічае ў гэтым напрамку наша «суседка» Польшча, якая распускае ўсялякую хлусьню пра наш Савецкі Саюз.

Будзе вайна, ці ня будзе? Аб гэтым сяляне ў вёсцы пытаюцца. Таварышы, **бальшавіцкая партыя і савецкая ўлада заўсёды правядзіла і будзе праводзіць да канца мірную палітыку.** Мы вайною не зацікаўлены. А імпэрыялістыя ўсіх краін хочуць і думаюць нам навязаць вайну. Мы заўсёды будзем імкнуцца да таго, каб у больш мірных умовах будаваць нашу пралетарскую дзяржаву, каб мірным шляхам будаваць нашае сацыялістычнае будаўніцтва.

Наша партыя і савецкая ўлада заўсёды казалі, што мы вайны не жадаем. Капіталістыя-ж рыхтуюць супроць нас вайну. Таварышы, калі гэта так, дык мы таксама не павінны хлопаць вушамі, мы павінны быць заўсёды гаговымі і ўзмацняць абароназдольнасьць нашай дзяржавы. Мы, таварышы, гаворым, што імпэрыялістыя хочуць навязаць нам вайну і вайна ў выніку няўхільна, але калі яна пачнецца, калі яе навяжуць,— мне думаецца, што ня сёньня і ня заўтра, і нават не вясной гэтага году. Што-ж вы, таварышы, думаеце, што з намі проста заваяваць? Не, ня проста. На нас не адна капіталістычная дзяржава, ды нават і цэлыя групы ня змогуць так проста напасьці, бо мы за гэтыя гады мірнага будаўніцтва ўжо ўзмацнілі нашу эканоміку, узмацнілі нашу абароназдольнасьць, а таксама ўзмацнілі і нашу асноўную зброю — Чырвоную армію. У нас ужо такая Чырвоная армія, з якою наўрад ці адважыцца хто параўнацца.

Што-ж вы думаеце, капіталістыя гэтага ня ведаюць? Яны гэта добра ведаюць.

Акрамя таго мы маем такое становішча, што калі-б буржуазія і абвясьціла нам вайну, то мы ўпэўнены ў тым, што **пралетарыят Польшчы, Нямеччыны і інш. капіталістычных дзяржаў паверне штыкі супроць сваёй буржуазіі,** за Савецкі Саюз. Што значыць цяпер з намі ваяваць? Гэта значыць скруціць сабе галаву. З бальшавікамі ваяваць ня так лёгка. Таму я лічу, што вайны так хутка, як гэта гаворыць кулакі і правакатары, ня будзе.

Мы павінны даць рашучы адпор гэтай контр - рэвалюцыйнай кулацкай агітацыі з аргумантамі вайны, якою яны хочуць сарваць нашае будаўніцтва.

АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ ЗАМАЦАВАНЬНЕ КАЛГАСАЎ—У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

Я канчаю, і хачу сказаць вам аб наступным. Асноўны цэнтр нашай работы сёньня, важнейшае пытаньне калгаснага будаўніцтва на бягучы пэрыяд, на якім павінна быць сканцэнтравана ўся ўвага шырокіх бядняцка - серадняцкіх мас сялянства, — гэта, у першую чаргу, задача арганізацыйнага замацаваньня ўжо арганізаваных калгасаў.

Цэнтрам задачы пасьля таго, калі мы калектывізавалі каля 70 проц. пасеўнай плошчы, і павінна быць сканцэнтраваньне ўвагі на арганізацыйным і гаспадарчым узмацненьні калгасаў. Мы не павінны адставаць ад росту калгаснага руху і ў пырыню, але каб з посьпехам і надалей расьці калгасам у пырыню, трэба замацаваць, як належыць, тыя калгасы, якія мы ўжо арганізавалі, тады хутчэй рушымся па шляху далейшай арганізацыі новых калгасаў. Гэта ні ў якім разе не азначае, што мы павінны спыніць арганізацыю новых калгасаў. Не, мы павінны і далей арганізоўваць новыя калгасы, але самае важнае цяпер, як сьлед, замацаваць тое, што зрабілі.

Трэба падрыхтаваць насеньне на 100% з 10-процантным застрахаваным фондам. Інвэнтар таксама павінен быць падрыхтаваны. У гэтым, таварышы, асноўнае. Вы павінны ведаць, што калі мы добра арганізуем работу ў нашых калгасах, добра разьмяркуем рабочыя рукі, то ў нас і работа будзе ісьці добра, прычым трэба ведаць, што ў сувязі з недахватам машын, арганізацыя працы ў калгасах, рабочыя рукі ў калгасах зьяўляюцца рашаючым момантам у эфэктыўнасьці калгасу.

Паўтараю, таварышы, што **цэнтральная задача зараз—складаньне плянаў калгасаў і іх арганізацыйнае замацаваньне, правільная расстаноўка людзей, арганізацыя працы ў калгасах** — гэта галоўнае пытаньне, каб не праваронім вясны. Трэба вясну сустрэць ва ўсеўзбраеньні.

МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ВЫКАНАНЬНЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ АБАВЯЗКАЎ

Вы-ж ведаеце, таварышы, што дзяржава да калгасаў будзе прад'яўляць запатрабаваньні. Калі-б хто з вас падумаў, што раз ён пашоў у калгас, то дзяржава павінна ўтрымліваць яго на пэнсіі, вы-б зрабілі вялізарную памылку.

Мы арганізуем калгас не для таго, каб узяць на пэнсію ўсіх калгасьнікаў, а каб калгас хутчэй вырашыў задачу ўздыму сельска - гаспадарчай вытворчасьці. І мы да вас будзем прад'яўляць запатрабаваньні. Напрыклад, калі сёньня многія калгасьнікі ня хочуць ехаць у лес і вывозіць дровы, а гэтым самым зрываюць экспартны плян, а гэта значыць, што мы ня можам завезьці трактараў у калгас, дык што вы думаеце, мы вас за гэта на галоўцы глазіць будзем? Мы вам скажам, якія-ж вы калгасьнікі, калі ня можаце забясьпечыць выкананьне дзяржаўнага пляну, зрываеце лесавывазкі? Вы, такім чынам, папяровыя калгасьнікі, а ня сур'ёзныя людзі. Вывезьці, ці ня вывезьці лес, гэта значыць, будуць ці ня будуць у нас трактары. Трактары мы завозім з-за мяжы за валюту, а валюту мы атрымліваем за лес і інш. віды экспарту.

Калі калгас ня будзе выконваць дзяржаўных абавязкаў, ня будзе выконваць лесавывазак, кантрактацыі, заданьняў па ўраджайнасьці, якую (ураджайнасьць) мы праектуем павысіць на 25 проц. у калгасах, заданьняў аб павялічэньні жывёлы на 10 проц. у пераводзе на буйную жывёлу, калі ён не пашырыць плошчы ня менш, чым на 6 проц., то мы такі калгас на галоўцы не пагладзім, а скажам, што гэта папяровы калгас і можам нават расьпусьціць, як нягодны калгас. Вось як стаіць пытаньне.

Увагу ў калгас патрабуе максымальная напружанасьці сіл і сродкаў усяго працоўнага сялянства.

АБ БАТРАКОХ

Некалькі слоў аб батраках. Для таго, каб палепшыць уваход батракоў у калгасы, мы сёньня ў СНК ўхвалілі пастанову аб тым, каб ня менш 60.000 батракоў па Беларусі ўцягнуць у калгасы, мы вызваляем батракоў зусім ад уступнага ўзносу, тых батракоў, у каго няма ніякай маемасьці, вызваляем і ад членскіх узносаў. Мы ставім задачу рэгулярнага забесьпячэньня батракоў хлебам па цьвёрдых цэнах аж да новага ўраджаю. Мы даем дырэктыву праўленьням калгасаў, каб усе работы ў першую чаргу арганізоўваліся праз батрацкія брыгады і каб заработную плату ім выплачваць ня менш 60 проц., каб батраку было за што жыць, калі ў яго няма запасу. Мы-ж бярэмся забясьпечыць усіх батракоў хлебам па цьвёрдых цэнах ня менш, чым па 400 грам на чалавека ў дзень да новага ўраджаю. Мы даем дырэктыву аб арганізацыі зараз 2 млн. грашовага фонду спэцыяльна для забесьпячэньня батракоў зарплатай у калгасах. Мы робім усё, каб батрацтва паставіць у такія ўмовы, каб яно магло не адчуваць недахвату, прынамсі, у кавалку хлеба да новага ўраджаю.

Ваша задача выкарыстаць вашы правы, якія вам дае партыя і савецкая ўлада, стаць на чале калгаснага руху, змагацца з памылкамі, з апартунізмам і, з другога боку, з усялякімі заскокамі, біць і змагацца на два франты, праводзячы цьвёрда генэральную лінію нашай партыі, стварыць апору, актыў з бядняцка - серадняцкіх мас, на які наша партыя і савецкая ўлада маглі-б абаперціся.

Вы, батракі, павінны дыктаваць сваю волю ў калгасах, а не цягнуцца ў хвасьце за асобнымі хісткімі сераднякамі, часамі за кулакамі. Вось, як стаіць пытаньне.

НАШЫ ЗАДАЧЫ

Канчаючы, я павінен сказаць: вынікі калектывізацыі да сёнешняга дня гавораць аб тым, што лёд, як кажуць, рушыўся. Мы ўжо сталі абедзьвюма нагамі на шлях карэннай сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі і сапраўднага выкарчоўваньня карэньняў капіталізму.

Мы павінны зараз улічыць практыку нашай работы, там, дзе практыка добрая, выкарыстаць яе і надалей, там, дзе ёсьць памылкі, выправіць іх на ходу, адмятаючы ў бок усю мазьню і апартунізм, усе перагібы, працуючы на падставе правільнай лініі нашай партыі і савецкай улады, ідучы ўсё наперад. Запісаўся ў калгас — ні кроку назад. Хто назад аглядзецца, хістаецца, той дапамагае кулаку.

Наша задача зараз — шырокімі калгаснымі масамі рушыцца наперад і, на падставе генэральнай лініі нашай партыі, зрабіць усё, каб уся наша Савецкая Беларусь у бліжэйшы год з дробна-сялянскай стала сапраўднай калгаснай Беларусьсю. Мы ўжо сталі на шлях арганізацыі аграіндустрыяльных камбінатаў БССР.

Наша задача зараз — ня рыпацца назад, а ісьці наперад, па шляху рэарганізацыі нашай Савецкай Беларусі ў магутны ўсебеларускі агра - індустрыяльны калгас—камбінат.

*) Працяг. Пачатак глядзі «Зьвязды» № 55.

У фашысцкіх засьценках Зах. Беларусі

Беларускія нацыянал-фашыстыя ўдарным тэмпам выдумляюць і распаўсюджваюць усялякую хлусьню і бязглузьдзіцу аб Савецкім Саюзе і асабліва аб Савецкай Беларусі. За апошнія дні беларускія нацыянал-фашыстыя і іх брудны дафэнзіўны орган «Наперад» пачалі старанна «салзіць» у турмы ўсіх культурных дасягнаў БССР. Так, яны «пасадзілі» ў «засьценкі чэка» т.т. Ігнатоўскага, Якуба Коласа і інш.

Рабочыя, сяляне і працоўная інтэлігенцыя БССР з вялізарнейшым абурэньнем пратэстуюць супроць гэтае хлусьні. Самі «арыштаваныя» ўжо далі свой адказ беларускім нацыянал-фашыстым.

Гэтыя «утки» маглі-б выклікаць толькі пагарду і сьмех, калі-б яны ня мелі на мэце прыкрыць тыя злачынствы польскага фашызму і беларускіх нацыянал-фашыстых, якія робяцца пад дымавою заслонаю гэтых паклёпаў і хлусьні.

Лепшыя сыны беларускіх працоўных мас Заходняй Беларусі кідаюцца ў турмы, арыштоўваюцца дзеячы беларускага нацыянальна-вызвалеўчага руху паводле паказу беларускіх нацыянал-дафэнзіўшчыкаў з-над сьцяны Луцкевіча і К°.

Аб гэтых арыштах, хваля якіх шырока разьліваецца за апошні час па Беларусі, вы ні слова ня знойдзеце ў беларускім фашысцкім друку. Вы таксама ні слова ня знойдзеце аб тых катаваньнях і зьдзеках, якія перажываюць рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне ў польскіх засьценках і турмах.

Вось жменька фактаў, якія кідаюць прамень сьвятла на забойчыя ўмовы жыцьця ў турмах Заходняй Беларусі.

Палітвязьні з **Горадні** паведамляюць аб жудасных турэмных умовах аб узмацненьні рэпрэсій, напрыклад, аб замаху турэмнай улады на турэмную камуну палітвязьняў, на іх бібліятэку. Гігіенічна-санітарныя ўмовы жудасныя: у камэры, разьлічанай на 16—18 чалавек, знаходзіцца па 40—48 зьняволеных. Прагулянкі маюць толькі адну гадзіну. З прычыны дрэннага харчаваньня і вільгаці ў камэрах ужо праз кароткі час прабываньня ў турме палітвязьні захворваюць на сухоты і іншыя заразныя хваробы. Адміністрацыя хворых не забірае ў шпіталь і не дае ім ніякай мэдычнай дапамогі. Мала таго, яна забраніла палітвязьням лячыцца нават на ўласны кошт. Пасылы ў камэрах не хапае. На камэру выдаюцца толькі два кубкі, з якіх п'юць усе палітвязьні, таму яны лёгка заражаюцца адзін ад другога, што ішчэ больш пагоршае гігіенічныя умовы палітвязьняў. **Фабрычкаваць чым больш «чырвоных трупаў» — вось палітыка польскага фашызму.**

У пачатку сьнежня ў адказ на рэвалюцыйныя сьпевы палітвязьняў у дзень 7-га лістапада — вядомы кат люблінскай турмы, які зараз зьяўляецца начальнікам горадзенскай, прабаваў пазбавіць іх важнейшага права—дзяліць харчы паміж усімі палітзьняволенымі Горадні. Палітзьняволеныя рэзка пратэставалі супроць новых замахаў на іх правы, каб не дапусьціць да таго, што адны таварышы галадаюць, у той час, калі іншыя атрымліваюць харчы з дому. Палітвязьні Горадні ўжо на працягу трох тыдняў вядуць барацьбу ў абарону сваіх правоў шляхам байкоту праверкі, прагулак і статканьняў.

Барацьбу палітвязьняў падтрымліваюць рабочыя і сяляне. Наладжваюцца дэманстрацыі пратэсту перад турмою, дэманстрантамі разьбіта 8 шыб у кватэры начальніка турмы, прымаюцца рэзалюцыі супроць катаваньняў палітвязьняў. У ваколіцах Горадні сяляне зьбіраюць харчы для палітвязьняў, праводзяць грашовыя зборы і г. д.

Ня гледзячы на ўсе гэтыя рэзкія выступленьні супроць турэмнай адміністрацыі, наступленьне апошняе на правы палітвязьняў ня спыняецца. 200 палітвязьняў Горадні стаіць напярэдадні галадоўкі.

ВІЛЬНЯ. Зьбіваньні і катаваньні палітвязьняў (у Лукішках) сталі звычайнымі зьявішчамі. Ужо некалькі месяцаў правакатары, якіх адміністрацыя пасадзіла ў камэры палітзьняволеных, робяць жыцьцё апошніх абсалютна нязносным. Правакатары робяць таксама немагчымымі і прагулкі палітзьняволеных, бо яны нападаюць на палітзьняволеных, і зьбіваюць іх пры актыўнай дапамозе адміністрацыі. Адміністрацыя ўжывае да палітвязьняў у Лукішках «удасканаленыя» мэтады, якія ствараюць надзвычай жорсткія турэмныя умовы: адлучаюць рабочых ад інтэлігенцыі, беларусоў ад яўрэяў, стараюцца нацкоўваць палітвязьняў аднае нацыянальнасьці на другую і г. д. Адміністрацыя канфіскавала лепшую частку літэкі.

Турэмнае харчаваньне настолькі пагоршылася, што самы здаровы чалавек ня мог-бы пражыць на ім без дапамогі пастароньняй нават некалькі месяцаў. Кожнага селяніна і рабочага, якія адважваюцца прынесьці харчы для палітзьняволеных, арыштоўваюць і саджаюць у турму.

У адказ па зьбіваньне палітзьняволеных і правядзеньне фашысцкага турэмнага рэгляменту, віленскі пралетарыят, пад кіраўніцтвам «Чырвонае Дапамогі» распачаў кампанію супроць белага тэрору, які вядзецца ўжо ў працягу двух тыдняў. На ўсіх сходах у саюзах прымаюцца аднагалосна рэзалюцыі пратэсту супроць белага тэрору, за вызваленьне палітзьняволеных, пасылаюцца прывітаньні рэвалюцыйным барацьбітом, якія знаходзяцца за кратамі.

Гэтая кампанія ўжо ахапіла тысячы дарослых рабочых і рабочае моладзі, якія адгукнуліся на заклік «Чырвонай Дапамогі» дапамагаць палітзьняволеным Лукішак як маральна, так і матар'яльна і брацъ удзел у агульнай барацьбе рабочых і сялян супроць фашысцкага ўраду, за пралетарскую дыктатуру.

БЕРАСЬЦЕ. Фашысцкая адміністрацыя пад рознымі прычынамі адбірае рэшткі правоў палітзьняволеных. Яна ліквідуе камэры палітзьняволеных. Каб палегчыць сабе гэтую задачу, адміністрацыя ў канцы сьнежня выслала пераважную частку палітзьняволеных у Вронкі, Седлец і ў інш. турмы Польшчы, а рэшту разьмясьціла паміж крымінальнікамі. Новых зьняволеных адміністрацыя зьмяшчае ў камэры крымінальных.

Такія-ж весткі маем мы і з цэлага раду іншых турэм Зах. Беларусі.

Пагаршэньне рэжыму ў турмах Польшчы, асабліва ў турмах Заходняй Беларусі, зьяўляецца складанай часткай агульнае палітыкі польскага фашызму, які рыхтуе вайну супроць СССР. Для гэтага польскі фашызм узмацняе сыстэму рэпрэсій у адносінах да рабочых і сялян, да нацы

БУДАЎНІЦТВА ВЫСТАЎКІ ЗРЫВАЕЦЦА...

а Белдзяржбуд і дырэкцыя займаюцца спрэчкамі

Гэтымі днямі адбылося пасяджэньне пленуму дырэкцыі Ўсебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці, на якім быў пастаўлены даклад Белдзяржбуду аб будаўніцтве павільёнаў выстаўкі.

З дакладу высьветлілася, што падрыхтоўчая работа да выстаўкі пастаўлена вельмі дрэнна. Да будаўніцтва раду вельмі важных павільёнаў яшчэ ня прыступлена. Пракладзеныя ў зямлі водаправодныя трубы засталіся зімаваць негасыпанымі. Павільён мэханізацыі і электрафікацыі зімуе без страхі. На некаторых павільёнах адвальваецца тынкаваньне.

Есьць цэлы рад і іншых хібаў у будаўніцтве. Тэхнічны нагляд за будаўнічымі работамі выстаўкі пастаўлены вельмі кепска. Рабочых на пабудове мала — усяго каля 170 чалавек, з іх кваліфікаваных толькі 60.

З такім лікам людзей скончыць у тэрмін будаўніцтва павільёнаў ніяк нельга.

Але горш за ўсё стаіць справа з матар'ялямі, якіх, паводле заявы прараба выстаўкі тав. Чаховіча, усяго толькі на 2 дні. Такое становішча з матар'ялямі зьяўляецца катастрафічным. Адпаведныя арганізацыі павінны ў тэрміновым парадку забясьпечыць будаўнічыя работы на выстаўцы патрэбнымі матар'ялямі, у першую чаргу лесаматар'ялямі.

Лесбел таксама павінен падцягнуцца, каб будаўніцтва выстаўкі ня было сарвана.

Але горш за ўсё тое, што Белдзяржбуд і дырэкцыя выстаўкі ўвесь час спрачаюцца аб тым, хто павінен забясьпечваць будаўніцтва выстаўкі матар'ялямі. Дырэкцыя выстаўкі лічыць, што гэта справа Белдзяржбуду, апошні заяўляе, што з ім яшчэ не заключаны канчатковы дагавор.

Трэба спыніць усялякія спрэчкі і зараз-жа прыступіць да канкрэтнае работы. Трэба зрушыць будаўніцтва выстаўкі з мёртвага пункту, бо ніяк нельга прызнаць нармальным такое становішча, што за 8 месяцаў усе работы па будаўніцтве выстаўкі праведзены толькі на 40-45 проц. Часу засталося вельмі мала і трэба нагнаць упушчанае. Выстаўка павінна быць адкрыта ў тэрмін.

Н.

МЕСЯЧНІК АШЧАДНАСЬЦІ

Дырэктывы аб месячніку пад сукном

Заданьне за люты ня выканана

Апошняя дэкада лютага дала агульны прыліў укладаў па ўсіх ашчадных касах БССР у суме 137.000 руб. супроць 285.000 за другую дэкаду. Такім чынам, апошняя дэкада характарызуецца **пасляблененым тэмпу росту ўкладаў, што сьведчыць аб вельмі слабым разгортваньні кампаніі.**

Найбольшы прыліў укладаў падае на **Менскую акругу** — 48 тысяч руб., але гэта сума складае якраз палову таго, што даў Менск у другую дэкаду месяца

Бабруйшчына выканала за апошнюю дэкаду столькі-ж, колькі за папярэднюю 34,8 тысяч руб.

Значнае зьніжэньне дае **Гомельшчына** —12.000 руб. супроць 53.000 за другую дэкаду, а таксама Віцебская акруга, дзе за апошнія 10 дзён паступіла толькі 2.000 руб. Пагражаючае становішча па **Магілеўшчыне**, якая за апошнюю дэкаду зусім ня мела новых укладаў.

Некаторае павышэньне ліку ўкладчыкаў адзначаецца па Полацкай і Мазырскай акругах, якія далі сумесна 35.000 руб. супроць 20.000 за папярэднюю дэкаду.

Апошняя дэкада лютага характарызуецца зьявішчамі **адліву ўкладаў з ашчадных кас акруговых цэнтраў.** Зьмяншэньне ўкладаў мела месца ў Віцебску, Магілеве, Воршы, Бабруйску і Мазыры. Адліў складае суму каля 45.000 руб. У той-жа час адзначаецца павялічэньне ўкладаў па сялянскім сэктары: за апошнюю дэкаду ўцягнута 53 тысячы руб. новых укладаў замест 30 тысяч у папярэднюю дэкаду.

За апошнія 10 дзён лютага паступіла новых укладчыкаў па ашчадных касах БССР каля 21.000 чал., з іх палова — 10.000—падае на сялян.

Спачатку кампаніі за ўвесь люты ўцягнута новых укладчыкаў 44.000 чалавек, у тым ліку 20.000 сялян. Гадавое заданьне па ўцягненьні ўкладчыкаў выканана на 1-га сакавіка на 52 проц.

На 1-га сакавіка заданьне месячніка ашчаднасьці выканана толькі на 21,3 проц. Такім чынам, **агульныя вынікі месячніка нездавальняючыя.** У тэрмін, які застаецца да канца кампаніі, трэба нагнаць прапушчанае.

Н. Л.

***

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Месячнік ашчаднасьці па Магілеўшчыне фактычна сарваны. Ніхто ня выконвае складзеных плянаў, партыйныя, савецкія і прафэсіянальныя арганізацыі на мясцох нічога ня робяць, каб разгарнуць кампанію. Акруговыя праўленьні саюзаў зусім ня цікавяцца гэтай справай. У выніку па акрузе ўвесь час наглядаецца адліў зьберажэньняў. У асобных раёнах адліў укладаў набыў самы шырокі разьмер. У Быхаўскім раёне за трэцюю дэкаду лютага лік укладаў зьменшыўся на 4.000 руб., у Прапойскім —на 1.330, у Хоцімскім — на 1.324 руб. і г. д.

Некаторыя акруговыя ўстановы злачынна адносяцца да месячніка. Інспэктарыят нарасьветы 2-га лютага атрымаў Наркамасьветы дырэктывы аб правядзеньні месячніка і палажыў іх на сукно, дзе яны праляжалі да 28-га лютага. У Быхаўскім РВК брыгадзе па правядзеньні месячніка адказалі: «на нямa часу займацца гэтай справай, мы нічога ня робім, бо ёсьць больш важныя кампаніі». У Магілеўскім раёне да 22-га лютага нават не разьмеркаваны кантрольныя лічбы. Няма чаго гаварыць аб давядзеньні плянаў да вёсак і раёнаў.

Чэрыкаўская камісія садзейнасьці нават не прыступіла да разгортваньня месячніка.

Нічога ня робіцца і ў Чачавіцкім раёне; тройка садзейнасьці месячніку распалася; пляны не даведзены да сельсаветаў. Загадчык касы пры Клімавіцкім агенцтве Дзяржбанку адмовіўся зрабіць даклад аб месячніку і наогул зрывае работу.

Пара пакласьці канец безадказнасьці і злачыннай нядбайнасьці ў разгортваньні месячніка ашчаднасьці.

А. С.

ЗЬВЯЗДА.

АГРАНОМЫ СЯДЗЯЦЬ У КАНЦЫЛЯРЫЯХ

Мабілізацыя с.-г. спэцыялістых на работу ў калгасы праваленa

З 184 МАБІЛІЗАВАНА ТОЛЬКІ 84

Мабілізацыя агра-спэцыялістых Менску на работу ў калгасы скончана. Вынікі мабілізацыі сьведчаць аб тым, што фактычна пастанова Савету Народных Камісараў СССР аб мабілізацыі 90 проц. агра-спэцыялістых ня выканана.

«Зьвязда» ня раз сыгналізавала небясьпеку зрыву гэтай важнейшай работы. Мы паказвалі на тое, што мабілізацыя праводзіцца **неарганізавана і наступ праходзіць слаба.** Аднак, ня гледзячы на сыгналы «Зьвязды», арганізацыі **нічога не зрабілі для паляпшэньня работы па мабілізацыі спэцыялістых. У выніку гэтая работа фактычна праваленa.**

Вось лічбы, якія гавораць самі за сябе: з 184 спэцыялістых, паданых у спісах 22-ма цэнтральнымі і акруговымі ўстановамі, **мабілізавана толькі 84 зап., што складае 52 проц.** (паводле даных ЦП саюзу Сельгаслесрабочых). Такім чынам **замест 90 проц.** вызначаных пастановаю СНК СССР, установы БССР далі толькі **52 проц. спэцыялістых.**

Наркамзем БССР, Наркампрацы і Белкалгасцэнтр недастаткова мабілізавалі ўвагу грамадзкасьці вакол мабілізацыі спэцыялістых. Па радзе ўстаноў мабілізавана толькі **36-40 проц. спэцыялістых.** У Белкалгасцэнтры з 12 спэцыялістых, якія абвясьцілі сябе мабілізаванымі на работу ў калгасы, выехалі толькі 4 чал., у Белпалядоўсаюзе з 14 спэцыялістых, мабілізавана 6, у навукова-дасьледчым інстытуце імя Леніна з 46 спэцыялістых мабілізавана — 11, у Белсельтрэсьце з 13 мабілізавана — 5, у Беларускай Акадэміі Навук з 3 — 1 чал. і г. д.

Нават, Наркамзем БССР з 31 спэцыяліста мабілізаваў на работу ў калгасы толькі 14 чал.

Характэрна, што затрымка ў гэтай рабоце не за спэцыялістымі, а выключна за ўстановамі. Спэцыялістыя ўсе абвясьцілі сябе мабілізаванымі і выказалі гатоўнасьць выехаць на месцы. Аднак, установы не адпускаюць іх. Наркамзем-жа, Наркампрацы і Белкалгасцэнтр надта мякка падыходзілі пры правядзеньні мабілізацыі і задавальнялі просьбы гаспадарнікаў аб аслабленьні тых ці іншых спэцыялістых.

Нарэшце, трэба дадаць, што з мабілізаваных 84 чал., на сёнешні дзень атрымалі камандыровачныя пасьведчаньні толькі 42 чал.. Такім чынам, толькі палова мабілізаваных выехала на месцы. Рэшта спэцыялістых адкладваюць свой ад'езд невядома да якога часу.

Мы лічым, што мабілізацыю спэцыялістых неабходна працягнуць. Трэба дабіцца поўнага выкананьня пастановы ўраду СССР аб мабілізацыі 90 проц. агра-спэцыялістых.

Г.

Падрыхтоўка да палявых работ

Кармавая праблема выпала з-пад увагі Наркамзему

КАЛГАСЫ ЎЖО АДЧУВАЮЦЬ НЯСТАЧУ КОРМУ

СЫГНАЛЫ „ЗЬВЯЗДЫ" НЯ БЫЛІ ПАЧУТЫ

Сыгналы «Зьвязды» аб небясьпецы ў зьвязку з разбазарваньнем корму былі не дарэмнымі. На жаль, адпаведныя арганізацыі БССР, асабліва зямельныя, не зьвярнулі сур'ёзнай увагі на сыгналы «Зьвязды» і ня ўжылі рашучых мер. Вынікі такога благадушша тут-жа выказаліся. Вось факты, якія сьведчаць, што ў радзе месц з прычыны недахвату корму ўжо тармозіцца выкананьне такіх важнейшых мерапрыемстваў, як арганізацыя малочных фэрм і машына-конных станцый. З Гомеля паведамляюць, што далейшае існаваньне арганізаваных фэрм немагчыма, калі ня будзе дастаўлена звыш 2.000 тон фуражу. Фэрмы раней не паклапаціліся з запасам фуражу, а зараз яго нідзе нельга дастаць.

Апошнімі днямі ў аддзяленьні Саюзхлеба з калгасаў паступілі патрабаваньні аб забясьпячэньні іх фуражом. Калгасы просяць неадкладна даць ім сена, бо няма чым карміць жывёлу. Асабліва многа патрабаваньняў з Менскай і Бабруйскай акруг. Аб тым, што недахват кармоў пачынае набываць пагражаючы характар, сьведчыць разьмер патрабаваньняў, які ўжо вылічваецца беларускай канторай Саюзхлеба для ўсёй БССР у дзесятках тысяч тон.

Становішча, якое стварылася з кормам, па думцы загадчыка канторы Саюзхлеба, зьяўляецца вынікам разбазарваньня корму, якое ня спыняецца і па сёнешні дзень. Корм—пытаньне, якому і мясцовыя і цэнтральныя працаўнікі аддаюць менш за ўсё ўвагі і для вырашэньня якога ня прымалася раней ніякіх адпаведных практычных мер.

Аб стварэньні фуражных фондаў у калгасах амаль не гаворыць. Гэта пацьвярджаецца наступным: на мясцох ідзе арганізацыя 400 машына-конных станцый. Здавалася-бы, што Наркамзем і Белкамгасцэнтр павінны былі даўно забясьпечыць гэтыя станцыі кормам. Ня гледзячы на гэта, абедзьве арганізацыі нічога ня ведаюць, як стаіць справа ў гэтых адносінах. Паведамленьні-ж з месц гавораць, што арганізуемыя машына-конныя станцыі менш за ўсё думаюць аб стварэньні фуражнага фонду. У сьвятле гомельскага факту (немагчымасьць разгарнуць малочныя фэрмы з прычыны адсутнасьці фуражу) зусім анэкдатычнымі зьяўляюцца заявы працаўнікоў Белмалжывсаюзу, што з кормам у БССР добра.

САРТУЮЦЬ НАСЕНЬНЕ

Рэчыцкія раённыя арганізацыі мала цікавяцца падрыхтоўкай да сяўбы

У Рэчыцкім раёне падрыхтоўчая работа да веснавое сяўбы зрываецца. Ня гледзячы на тое, што на 25 лютага ў раёне знаходзіцца над калгасамі больш 43 проц. плошчы, раённыя арганізацыі нясур'ёзна адносяцца да пасеўнае кампаніі. Заданьне РВК па стварэньні насенных фондаў выканана толькі на 64 проц., па бульбе—80 проц.

Зусім кепска праходзіць у раёне і кантрактацыя пасеваў. Плян па кантрактацыі да апошняга часу выкананы толькі на 14 проц., заданьне па ачыстцы збожжа выканана ўсяго на 60 проц.

Патрэбен самы рашучы пералом у рабоце па падрыхтоўцы да веснавое сяўбы. У адмоўным выпадку пасеўная кампанія ў Рэчыцкім раёне будзе сарвана.

Каламіец.

138

ЗАМЕСТ 370

„Хойнікам машына-конныя не патрэбны"

Арганізацыя машына-конных станцый па БССР усё яшчэ праходзіць марудна. Паводле апошніх даных па ўсіх акругах арганізавана 138 станцый з 370 паводле пляну з агульнай колькасьцю 13.640 коняй, што складае 37,3 проц. заданьня.

Гомельская акруга выканала плян арганізацыі машына-конных станцый на 80 проц., Менская—52,7 проц., Мазырская—34,3 проц., Полацкая—36,7, Магілеўская—30 проц.

Белсельтрэст павінен арганізаваць 41 машына-конную станцыю. Месцы для іх арганізацыі вызначаны. Але дагэтуль Белсельтрэст яшчэ ня ведае, што практычна зроблена ў справе арганізацыі машына-конных станцый.

***

Хойніцкія раённыя арганізацыі зусім не разумеюць важнасьці стварэньня машына-конных станцый. Так, напрыклад, старшыня райкалгасаюзу т. Ізьмер даводзіць, што ва ўмовах Хойніцкага раёну няма вострай патрэбы ў арганізацыі машына-конных станцый. Ён сваё палажэньне ўгрунтоўвае тым, што Хойніцкі раён у патрэбнай колькасьці забясьпечаны гужавою сілаю і патрэбнымі нескладанымі сельска-гаспадарчымі машынамі.

Раённыя работнікі не разумеюць таго, што машына-конныя станцыі арганізоўваюцца для поўнага выкарыстаньня ўсіе наяўнасьці коняй і с.-г. машын на працягу не 6—8 гадзін, як гэта заведзена, а 15—18 гадзін.

Пасьля арганізацыі машына-конных станцый увесь лішак коняй можна і трэба будзе перадаць у тыя раёны, дзе наогул гужавое сілы не хапае. Вось усіх гэтых простых ісьцін хойніцкія раённыя працаўнікі якраз не разумеюць ці ня хочуць разумець.

Такія думкі і настроі аб тым, што на трэба арганізоўваць машына-конных станцый, пераносяцца, зразумела, і ў калгасы. Праўленьні калгасаў прытрымліваюцца наконт арганізацыі машына-конных станцый такой-жа думкі, як і кіраўнікі з раёну.

Так, напрыклад, паводле заданьня акркалгасаюзу, у Хойніцкім раёне павінны былі быць заснаваны 3 машына-конныя і 1 конна-трактарная станцыя

Між тым, у раёне аб арганізацыі такіх станцый нават і ня думаюць.

Акркалгасаюз павінен умяшацца ў гэту справу і прымусіць хойніцкія раённыя арганізацыі прыступіць да канкрэтнае работы па заснаваньні машына-конных станцый, якія, наперакор жаданьням і разважаньням хойніцкіх працаўнікоў, абавязкова павінны існаваць у Хойніцкім раёне. Толькі пры такіх умовах можа быць правільна арганізавана праца ў калгасах.

Брыгадзір «Зьвязды» ПЯЧОНКА.

82 трактары не адрамантаваны

З 151 ТРАКТАРА, ЯКІЯ ПАТРАБУЮЦЬ РАМОНТУ, ПА БССР ДАГЭТУЛЬ АДРАМАНТАВАНА 69 ТРАКТАРАЎ—45,6 ПРОЦ.

ГОМЕЛЬШЧЫНА ВЫКАНАЛА ПЛЯН РАМОНТУ ТРАКТАРАЎ НА 80 ПРОЦ., МАГІЛЕЎШЧЫНА—60 ПРОЦ., ВІЦЕБШЧЫНА—76 ПРОЦ., МЕНШЧЫНА—44 ПРОЦ.

АРГАНІЗАВАНА 237 МАЙСТЭРАНЬ ПА РАМОНЦЕ С.-Г. МАШЫН, АДРАМАНТАВАНА 4.410 МАШЫН.

Перавыбары сельсаветаў

КРЫЧАЎСКІ І ПОЛАЦКІ ПРАВАЛЫ СЫГНАЛІЗУЮЦЬ

БЕДНАТА І БАТРАЦТВА НЕ ЗГУРТАВАНЫ. ГЭТЫМ КАРЫСТАЮЦЦА КУЛАКІ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ Ў СЕЛЬСАВЕТЫ „СВАІХ ЛЮДЗЕЙ"

Перавыбрана 49 сельсаветаў

Паводле вестак інфармацыйнага аддзелу ЦВК, па БССР на 7-га сакавіка перавыбрана 49 сельсаветаў, што складае 3,8 проц. усіх сельсаветаў Беларусі (акрамя Магілеўшчыны і Бабруйшчыны, ад якіх няма вестак).

З 124.375 выбаршчыкаў на перавыбарчыя сходы ў гэтых сельсаветах зьявілася 64,4 проц. (на 5,6 проц. больш мінулага году), яўка жанчын дасягае 52,8 проц. (у параўнаньні з мінулым годам павялічылася на 10,4 проц.).

Пазбаўлены выбарчых правоў 4,5 проц. усяго насельніцтва (у мінулым годзе — 2,4 проц.).

Выбрана ў члены сельсаветаў 2.672 чал., у тым ліку — **21,8 проц. жанчын, 10,5 проц. камуністых** (у 1929 годзе — 9,4 проц.), **камсамольцаў — 7,9 проц.**

Сельска-гаспадарчых рабочых і батракоў выбрана 7,6 проц. (1929 г.— 4,4 проц.).

Калгасьнікаў у сельсаветы выбрана 1.906 чал. — 71,3 проц.

Па асобных акругах выбрана сельсаветаў: Аршаншчына — 9 сельсаветаў, Віцебшчына — 12, Гомельшчына — 10, Мазыршчына — 2.

КРЫЧАЎСКІ ПРАВАЛ

Большасьць камуністых адсутнічала на перавыбарчых сходах

Царкоўныя нарады кулакоў, манахаў, папоў і.. камсамольская танцулька

Перавыбары Крычаўскага местачковага савету правалены. З пяці перавыбарчых сходаў тры сарваліся з-за няяўкі выбаршчыкаў, два былі праведзены пры 40-45 проц. яўкі выбаршчыкаў, у часе галасаваньня ў залі амаль нікога не засталося. Райвыканком назначыў новыя перавыбары.

Правал перавыбараў Крычаўскага местачковага савету — зьява не выпадковая. Прычыны яго наступныя:

У Крычаве на 5.000 выбаршчыкаў налічваецца каля 500 пазбаўленых, каля трох дзесяткаў кулакоў, у якіх канфіскавалі маемасьць, 50 манахаў і папаў, якія зьявіліся сюды з усяго раёну, валютчыкі і былыя эсэры. Уся гэта антысавецкая зграя вяла плянавую падрыхтоўчую работу да зрыву перавыбараў местачковага савету.

Ноччу рабіліся царкоўныя нарады, сэктанцкія сходы, днём кулакі і нейкія цёмныя асобы падбухторвалі сялянскія натоўпы. У сваёй дзейнасьці яны нават дайшлі да адкрытай вылазкі. Піянэры, якія разносілі повары, былі зьбіты. Некалькі раз пагражалі самому старшыні савету. На перавыбарчыя сходы зьяўлялася спэцыяльная група жанчын, якая ставіла сваёй мэтай сарваць сход.

У гэты самы час партыйна - камсамольская арганізацыя мястэчка, якая налічвала ў сваіх радох каля 150 асоб, бязьдзейнічала. **Яна не разгарнула культурна - мясавай работы, не мабілізавала ўвагі грамадзкасьці вакол перавыбараў.**

Прафсаюзная арганізацыя таксама не разгарнула выхаваўчае рботы сярод сваіх членаў.

Местачковы савет не праяўляе ніякай ініцыятывы, большая яго частка ня ўступае ў калгасы, вядзе агітацыю за зрыў падрыхтоўчай работы да веснавой сяўбы.

Большая частка камуністых на перавыбарчыя сходы не зьявілася. Камсамольская ячэйка ў часе сходу беднаты праводзіць сваю танцульку, б'е шыбы, сварыцца з беспартыйнай молодзьдзю.

Камуністы Капсэт рашуча адмаўляецца ўступіць у калгас. Сям'я камуністага Ваўчкова выступае супроць калектыву. Камуністы Рубэка ня хоча здаваць насеньня.

Сакратар камсамольскай ячэйкі Ільлін—кандыдат КП(б)Б — прыняў да сябе на кватэру кулака. Гэты самы местачковага савету. Вуліцы «старшыня» замест сходу, ідзе на вячорку.

Камсамолец Хайкін ідзе ў кіно, замест таго, каб пайсьці на перавыбарчы сход і г. д.

Зразумела, лепшага выніку чакаць нельга было. Але пакуль што яшчэ ня позна. Трэба прыняць усе меры да таго, каб крычаўскія памылкі былі выпраўлены.

Брыгадзір «Зьвязды» В. ВОІНА.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя лічыць неабходным у самы кароткі тэрмін разгледзець склад партыйна-камсамольскай арганізацыі Крычаўскага местачковага савету і прыняць партыйна - савецкія мерапрыемствы.

СЛАБЫ АДПОР КУЛАЦКАЙ АГІТАЦЫІ

На 4-ым па Вушацкім раёне (Полаччына) перавыбары прайшлі па 16 вучасткам (усяго 22). Новых членаў савету выбрана 29 чалавек. Яўка на сход у сярэднім не перавышае 70 проц. **Беднота і батрацтва да перавыбараў падрыхтаваны дрэнна.** А таму ня ўсюды даецца належны адпор кулацкім элемэнтам, і на перавыбарчых сходах ідзе бой за кандыдатаў у сельсаветы.

Больш заможная частка імкнецца правесьці ў склад сельсаветаў «сваіх людзей». Для дасягненьня сваіх мэт кулацкая часткай, як ніколі, выкарыстоўваюцца больш адсталыя канцы.

У Чараноўшынскім вучастку выбралі ў склад сельсавету самых заўзятых праціўнікаў калгаснага руху.

У Жарскім сельсавеце в. Ст. Сяло праваліла кандыдатуру старшыні праўленьня калгасу Дуброўскага, ледзь прынялі наказ сельсавету. У в. Магіліна праваліла кандыдатуру актывістага-калгасьніка, чырвонага партызана бедняка. У в. Азарэнкі праваліла бедняка-актывістага калгасьніка. Ва ўсіх пералічаных мясцох кулакі правялі «свае» кандыдаты.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што: 1) заможнікі стараюцца выкарыстаць перавыбары сельсаветаў для таго, каб забясьпечыць свой уплыў на сельсавет і праз сельсавет на ход калектывізацыі ў раёне.

Мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі **невыстарчальна заваструілі ўвагу батрацтва і беднаты на ролі сельсавету ва ўмовах суцэльнай калектывізацыі.** Кепска арганізавана батрацтва, беднота і калгасны актыў (ня ўсюды праводзяцца сходы беднаты). Не вядзецца работа сярод жанчын як па пытаньні калектывізацыі, так і па пытаньні перавыбараў сельсаветаў. Справаздачна-перавыбарчыя сходы ня ўвязваюцца з пытаньнем замацаваньня калгасаў.

Брыгадзір «Зьвязды» МІНОВІЧ.

Выбіраюць калгасьнікаў

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Паступілі ўжо весткі аб правядзеньні перавыбараў па двох вучастках — Уваравіцкага і Камарынскага раёнаў. З 1.580 выбаршчыкаў на выбарчыя сходы зьявілася 1.068 чалавек, або 67 проц. Жанчын зьявілася 54 проц.

Выбрана 29 членаў сельсавету, з якіх жанчын 8 або 27 проц. У склад гэтых сельсаветаў камуністых выбрана 14 процантаў і камсамольцаў 10 проц. З 29 чалавек батракоў налічваецца 27 проц. і беднякоў 54 проц.

Найбольш паказальным у перавыбарах зьяўляецца тое, што ў сельсаветы выбрана 89 проц. калгасьнікаў.

ГАРОДНІНА І МАЛАКО ДЛЯ МЕНСКУ

МЦРК, разам з Менсельпромам, арганізуе буйную малочна - гародную фэрму на плошчы ў 2.000 гэкт. Фэрма арганізуецца шляхам аб'яднаньня і пашырэньня існуючых саўгасаў Менсельпрому. Для паляпшэньня і пашырэньня малочнага стада, Менцэрабкоп асигнуе 300.000 руб.

Зараз на фэрме ёсьць 500 галоў малочнай жывёлы, МЦРК пастанавіў у бліжэйшы час павялічыць стада да 1.200 галоў.

На фэрме на плошчы ў 250 гэкт. будзе засеян гарод, які ўжо забясьпечаны насеньнем. Акрамя гэтага, для адкорму жывёлы на фэрме будуць засеяны кораньплоды і кармавыя травы.

Для забясьпячэньня Менску гародніной на працягу году МЦРК ужо заключыў дагавор з Паляводсаюзам на дастаўку 1 млн. пудоў бульбы, а Садсаюзам на пасеў спэцыяльна для Менску 913 гэкт. рознай гародніны.

У мінулыя гады МЦРК ня мог рабіць запасаў гародніны, з прычыны адсутнасьці прыстасаваных складаў для хаваньня гародніны. Адсутнасьць складаў прыводзіла да перабояў у забясьпячэньні насельніцтва гародніной.

У бягучым годзе МЦРК прыступае да пабудовы складаў для хаваньня гародніны на 4.000 тон. Склады будуюцца на адным вучастку, пры чым да складаў будзе праведзена спэцыяльная чыгуначная ветка.

Створаны спэцыяльны будаўнічы камітэт пры ЦРК, які ў першую чаргу займецца будаўніцтвам складаў для хаваньня гародніны.

Кантрактацыя гародніны—пад пагрозай зрыву

Аб тым, як нашы арганізацыі адносяцца да пытаньняў разьвіцьця гародніцтва ў Беларусі, гавораць весткі, як праходзіць кантрактацыя. На 1-га сакавіка ў Віцебскай акрузе з 1.459 гэкт. закантрактавана ўсяго толькі 270 гэкт., у Полацкай акрузе з 800 гэкт.—100 гэкт., у Аршанскай акрузе з 650 гэкт.—толькі 113, у Бабруйскай—з 1.400,—1.200 гэкт., у Менскай акрузе з 1.125 гэкт.—113 гэкт.

Зусім няма вестак аб ходзе кантрактацыі гародніны ў Мазырскай і Магілеўскай акругах.

Калі ня ўжыць тэрміновых мер, кантрактацыя гародаў будзе сарвана.

...ЛКІ БРЫГАДАЙ РАБОЧЫХ

Па БССР

Падбудова буйных аграіндустрыяльных камбінатаў на Магілеўшчыне

МАГІЛЕЎ. (Наш. кар.). Прэзыдыум акрвыканкому зацьвердзіў праект арганізацыі 2-х буйных агра - індустрыяльных камбінатаў: у Шклоўскім раёне на плошчы 94.000 гэкт. камбінату Ільна малочнага напрамку, у Быхаўскім раёне на 107.000 гэкт.—бульбяна-малочнага напрамку. Узьнята перад НКЗ і Дзяржплянам хадайніцтва аб хутчэйшым зацьвярджэньні праектаў камбінатаў.

Пушчанана швэйная фабрыка

БАБРУЙСК. (Наш кар.). 3-га сакавіка пушчана ў ход новая Бабруйская швэйная фабрыка. Фабрыка цалкам мэханізавана, на ёй будзе працавацьі каля 1.000 рабочых. Гэтымі днямі фабрыка пераходзіць на бесьперапынны рабочы тыдзень.

Праекты пабудовы—пад рабочы кантроль

ВОРША. (Наш кар.). Вытворчая камісія групкому будаўнікоў, разам з прафактывам і рабочымі, разгледзела праекты новых пабудоў Жыласаюзу — лазьні, 3-хпавярховага дому і 2-х тыповых дамоў для жыллёвай каапэрацыі.

Праекты будаўніцтва ўпяршыню разглядаліся на рабочай вытворчай нарадзе, і таму гэтае пытаньне выклікала вялікую зацікаўленасьць у рабочых-будаўнікоў.

Рабочыя адзначылі, што зараз трэба адмовіцца ад пабудовы дамоў старога індывідуальнага тыпу. Трэба перайсьці да пабудовы дамоў - камун, прыстасаваных да ўмоў новага быту.

Рабочыя ўхвалілі праекты тыповых дамоў ЖАКТ'аў, якія маюць агульную кухню, сталоўку, чырвоны куток і дзіцячы агульны пакой.

МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ ПА БССР

У Менску

— На ўсіх прадпрыемствах адбыліся агульныя сходы рабочых і работніц, прысьвечаныя дню 8-га сакавіка.

— У рабочых клюбах адбыліся ўрачыстыя вечары, на якіх паставлены даклады аб міжнародным дні работніцы; у клюбах былі арганізаваны дзіцячыя пакоі, каб работніцы маглі наведаць вечары.

— На фабрыцы Меншвэй адбылася закладка памяшканьня для ясьлей. Ясьлі разьлічаны на 70 чал.

— На фабрыцы «Адраджэньне» адкрыты новы цэх — лазовы. У гэтым цэху будуць працаваць выключна жанчыны.

У Мазырскім і Сьміпавіцкім раёнах адкрыліся курсы для падрыхтоўкі выхавальніц з асяродзінча калгасьніц.

— На гуце «Пралетары» за добрыя адносіны да працы прэміявана 6 жанчын. У вязальным цэху 18 старых работніц абвясьцілі сябе ўдарніцамі. У партыю перадана 6 работніц.

Тав. Дзямідовіч—адзіная майстар-сэпаратаршчыца ў Беларусі. Працуе на дражджавым заводзе «Чырвоная Зара». Лепшая ўдарніца. Трэба ўлічыць, што праца каля сэпаратара—цяжкая

У Гомелі

— На заводзе «Пралетары» ў дзень 8-га сакавіка адбыўся дзіцячы ранішнік, а ўвечары на сходзе работніц быў пастаўлены даклад адміністрацыі аб удзеле работніц у выкананьні прамфінпляну. 6 работніц пастанавілі адлічаць, пачынаючы з сакавіка да канца пяцігодкі, кожны месяц і проц. зарплаты ў фонд індустрыялізацыі.

— У друкарні «Палесдрук» брыгады работніц і жонак рабочых выехалі ў падшэфны калгас. Выпуск спэцыяльнага нумар насьцегазэты, прысьвечаны жаночаму дню. Арганізавана жаночая ўдарная камуна.

Дзьве работніцы вылучаны на кваліфікаваную работу ліпаўшчыкоў. Жонкі рабочых правялі нядзельнік на карысьць МОПР'у, які даў звыш 80 руб. На ўрачыстым вечары 9-га сакавіка будзе заключаны сацыялістычны дагавор з работніцамі ф-кі «Камінтэрн».

— На швэйнай ф-цы «Камінтэрн» адбыўся ўрачысты вечар, на якім работніцы рапартавалі аб сваім удзеле ва ўсіх галінах партыйнага, савецкага і прафэсыянальнага будаўніцтва.

Тав. Юдзілевіч—брусоўшчыца цэху па вырабе загатовак абутковай фабрыкі (Менск). Вытворчы стаж—5 год. Норма брусоўкі—547 пар загатовак. Робіць яна 800 пар за дзень.

У Бабруйску

— У міжнародны дзень работніцы пушчаны новы турба-генэратар гарадзкое электрастанцыі на 1.120 кілёват. Машына абслугоўвае патрэбы ўсяго гораду і прамысловасьці.

— Бабруйскі ЦРК адкрыў новую сталоўку на 2.000 абедаў у дзень. Работа ў сталоўцы часткова мэханізавана — ёсьць бульбачыстка, мясарубка, хлебарэзка. Сталоўку абслугоўвае штат у 65 чал.

Масавы сход пралетарскае салідарнасьці

На сход мопраўцаў гор. Менску сабраліся для таго, каб яшчэ раз выказаць сваю пралетарскую салідарнасьць з 20-цімільённай арміяй беспрацоўных у капіталістычных дзяржавах, якая выступае 6 сакавіка на вуліцах пад лёзунгам «Хлеба і работы», пратэстуючы супроць капіталістычнай рацыяналізацыі.

Ілюб акрвыканкому, у якім праходзіў масавы сход, перапоўнены рабочымі, служачымі, чырвонаармейцамі. Усе чытаюць адозву ЦК Мопра СССР аб міжнародным дні паходу беспрацоўных. З вялікай увагай слухаюць даклад тав. Цэнцыпэра, які ахарактарызаваў сучаснае міжнароднае становішча, як становішча гнілой стабілізацыі капіталізму, катастрафічнага эканамічнага крызісу капіталізму, чым і выклікана мільённае беспрацоўе, аб антысавецкай кампаніі, якая зараз вядзецца і якая накіравана на падрыхтоўку імпэрыялістымі новай ваеннай авантуры супроць СССР.

Тав. Цэнцыпэр заклікаў мопраўцаў узмацніць работу па шэфстве над палітычнымі зьняволенымі, як адно з лепшых форм пралетарскае салідарнасьці і пільна сачыць за падзеямі міжнароднага дня паходу беспрацоўных.

Пасьля дакладу выступілі ад палітэмігрантаў т. Кузьміч, які перадае аб становішчы рабочых і сялян у Заходняй Беларусі і Польшчы. Ён гаворыць, што беспрацоўныя Польшчы таксама выйдуць 6-га сакавіка на вуліцы Варшавы. Людзі і Вільні дэманстраваць сваю салідарнасьць разам з беспрацоўнымі ўсяго сьвету. Ад дэлегацыі Ўсебеларускага зьезду груп беднаты ніталі мопраўцаў т. Ваўноўскі (Мазыршчына). на польскай мове, тав. Шахновіч (Магілеўшчына) на яўрэйскай мове і тав. Сапляк (бядняка камуны «КІМ»). Усе яны гавораць: «мы заўсёды гатовы дапамагчы нашым братом і сёстрам зарубежных краёў. Мы зараз на зьезьдзе абмяркоўваем пытаньні арганізацыйнай работы ў калгасах. Перад намі зараз стаіць адказная задача ліквідаваць кулацтва, як клясу, але мы вас запэўняем, што з усімі гэтымі задачамі мы спраўлімся».

У прынятай рэзалюцыі па дакладу агульны сход заклікае ўсіх працоўных гор. Менску пільна сачыць за падзеямі міжнароднага дня паходу беспрацоўных. Мопраўцы абяцаюць, што яны заўсёды гатовы аказаць дапамогу беспрацоўным і барацьбітом рэвалюцыі. Агульны сход пратэстуе супроць бесчалавечнай эксплёатацыі рабочых і калёніяльных народаў капіталістымі. Таксама пратэстуюць супроць фашысцкага наступаньня і зьдзекаў над палітзьняволенымі.

Ц—н.

Да суровай адказнасьці скажальнікаў клясавай лініі ў судова-сьледчым апараце

(З матар'ялаў абсьледваньня камісіі ЦКК НК РСІ)

Камісія ЦКК-НКРСІ скончыла работу па абсьледваньні судова-сьледчых і пракурорскіх установаў раду округ. (Полацкай, Мазырскай, Гомельскай, часткова Віцебскай і Бабруйскай (па матар'ялах АКК РСІ).

Матар'ялы гэтага абсьледваньня займаюць звыш 30 друкаваных старонак, прасякнутых ганебна-злачыннымі фактамі скажэньня клясавай лініі, дапушчанымі асобнымі мясцовымі судамі ў гэтых округах.

Некаторыя прысуды паасобных судоў мелі такі «клясавы» выгляд, што ня верыцца, ці мелі яны месца ў савецкай дзяржаве. Цяжка верыць. Але-ж факты б'юць і вельмі моцна. Прагледзім больш выразныя факты скрыўленьня клясавай лініі (усіх зьмясьціць няма ніякай магчымасьці).

— «Барацьба» судовых установаў Віцебшчыны з капіталістычным элемэнтам.

Гандляр Шоўман за неаплату 2.906 руб. падатку—аштрафаваны на... 10 руб. Гандляр Лур'е, які толькі ў дзень суда ўнёс 859 руб., **па суду быў апраўданы** і справа па **немэтазгоднасьці (?)** была спышена. Мясьніку Гурэвічу за неаплату 1.425 руб.—адзін месяц прымусовых работ. Гандляр Мэерсон не аплаціў 1.184 руб.—аштрафаваны на 50 руб.

Гомельшчына. Гінзбург і Цэйтлін—буйныя гандляры мануфактуры за неаплату 18.508 руб., атрымалі адзін 15 і другі 8 месяцаў пазбаўленьня волі. Лейкін—буйны гандляр лесаматар'ялямі, не заплаціў 18.000 руб.—атрымаў 5 месяцаў пазбаўленьня волі. Утулін, Нахамкін і Ўманцаў—арандатары садоў, за нявыплату 16.000 руб. прысуджаны: Утулін—да аднаго году пазбаўленьня волі, а Нахамкін і Ўманцаў **да 8 месяцаў умоўна.**

Абрамаў—злосны няплатнік, кулак—за 103 руб. неаплачанага падатку атрымаў 4 месяцы прымусовых работ, між тым, у гэты час ён прадаў 5 кароў і пару коняй.

Лявоненка—уласьнік млына і крупадзёркі, плаціць падатку 657 руб., за нявыплату памольнага збору аштрафаваны ў 15 руб.

Полаччына. Манчынскі—мае гаспадарку з 21 з пал. дзес. зямлі, 5 коняй, 7 кароў, тры цялушкі, не хацеў плаціць падатку і **судом апраўданы.**

Быў і такі выпадак, калі гр-н Штэнцінг, за неаплату падатку ў суме 656 руб., быў прысуджаны да 6 мес. пазбаўленьня волі, з заменай на два месяцы прымусовых работ. Штэнцінг ад прымусовых работ **адмовіўся** (!), і парсуд пры ўдзеле пракуратуры замяніў яму першы прысуд 20 днямі пазбаўленьня волі.

Нелалёка адышлі ад сваіх суседаяў і суды Вабруйшчыны. Гандляра Мар'ясіна за неаплату 3.000 руб. прысудзілі да 9 месяцаў пазбаўленьня волі, **а пад варту яго ўзяць чамусьці забыліся.**

Цяпер паглядзем «клясавы» падыход да беднаты. Тут мы таксама маем шмат прыкладаў. Вось яны.

Мазыр. Справа № 453, падатку 8 р. 95 к., утаіў на адзін рубель, аштрафаваны ў чатырохразовым разьмеры.

Справа № 672, бедняк, утаіў падатку на 1 р. 20 кап., штраф у трохразовым разьмеры.

Справа № 499, падатку плаціць 7 р. 85 кап., утоена на 1 р. 50 кап., аштрафаваны ў пяцiразовым разьмеры.

Іншая рэч на справе 765. Плаціць падатку 81 р. 27 кап., **утаіў на 31 р. 12 кап.**, аштрафаваны ў **аднаразовым разьмеры.**

Цяпер некалькі прыкладаў бесчалавечага бюракратызму: «справа па абвінавачаньні доктара г. Слуцку—Фэйгіна ў **нядбайных адносінах** да сваіх абавязкаў»,—у выніку чаго хворы, прывезены ў больніцу, ня быў прыняты на працягу 3—4 гадзін і памёр на вуліцы». (ніпто сабе нядбайнасьць!). Памочнік пракурора, ня гледзячы на абурэньне рабочае масы Случчыны, гэтую справу спыніў па матывах, што «хворы ўсёроўна памёр-бы» і Фэйгін застаўся непакараным. Сапраўды «саламонава» рашэньне.

Але пойдзем далей. Справа судовага выканаўцы **Байкова.** Трэба было Байкову спагнаць з кулака Казьлякевіча па карысьць батрака Пашкоўскага 32 руб. і 15 пуд. збожжа. Тры разы Пашкоўскі прыяжджаў да Байкова за 90 вёрст, прысылаў яму фурманкі, якія Байкоў адсылаў і спагнаў з Пашкоўскага (батрака) 15 руб. прагонных, а замест прысуджанае батраку сумы, спагнана 92 кап. Калі-ж батрак зноў зьвярнуўся да Байкова, той яшчэ раз запатрабаваў прагонныя. Урэшце Байкоў папаў пад суд. Але справа яго перасылалася з парсуду ў акруговы і да гэтага часу яшчэ ня скончана.

Лёгка ўявіць сабе, якое ўражаньне робіць такая пяганіна на батрацтва, якому даўно трэ' было давесьці, што «Байкоўшчына» гэта здачыньства і што савецкі суд хутка і жорстка карае Байковых і ім падобных. А колькі часу справа можа ляжаць без усялякага руху, расказвае, справа па абвінавачаньні ў растраце былога старшыні Рэчыцкай інвалідзкай каапэрацыі **Лаўрыновіча,** якая праляжала чатыры гады (з 31-XII-25 г. па 1-XII-29 г.). А за гэты час «Лаўрыновічы» маюць магчымасьць растрацішь усе сродкі інвалідзкай каапэрацыі БССР, або перакінуцца ў іншыя хлебныя месцы.

Трэба адзначыць, што гомельскім растратчыкам і зладзеям жылося зусім ня кепска, аб гэтым крычыць справа загадчыка Белаўтапрамгандлю **Юргевіча,** які растраціў 2.000 руб. Справа пачалася 10-IV-26 г. і скончылася, нарэшце 25-III-29 г., прыгаворам да пазбаўленьня волі на тры гады. Але-ж амністыяй гэты тэрмін быў скарочаны напалову і з заменай прымусовымі работамі. Ня гледзячы на тое, што ў справе няма ніякіх вестак, ці выконваецца хаця гэты прысуд, пракурорам гэткая пастанова ня была апрацэставана.

Поп Ракаў, будучы старшынёю раўкамісіі некага таварыства «Перамога», мякка кажучы, прысвоіў 27 руб. Завялі справу, поп прызнаўся, а сьледчы яе спыніў **з-за немэтазгоднасьці.**

У Мазыршчыне ў гэтым напрамку становішча аднолькавае, аб чым сьведчыць справа № 9, па якой абвінавачваюцца супрацоўнікі паўднёва-заходняй чыгункі ў растраце і падлогу на суму 1.114 руб. 55 кап. Рабіліся фальшывыя вымсіваньні грошай на выдуманыя прозьвішчы. Справа па сваім абёме ўзрасла да 4-х тамоў, прызначаецца да слуханьня і адкладваецца **з-за няяўкі частки абвінавачаных** (а дзе-ж мера «перасячэньня»?). Праз некаторы час у распарадчым пасяджэньні гэта справа раптам спыняецца па матывах «што яна страціла грамадзкі інтарэс» (а грошы?).

Гэткіх спраў яшчэ ў стадыі сьледзтва было спынена: па Гомелі—44 проц., па Мазыры—32 проц. і па Полацку—41 проц.

Зараз паглядзем, як гэтыя суды разумелі самакрытыку:

«Нейкая гр-ка Рыўкіна на сходзе пайшчыкаў спажывецкага таварыства (Гомельшчына) назвала настаўніка Мартыненку—бюракратам. Завялі справу **і хутка скончылі.** Прыгавор—два месяцы прымусовых работ. Акрсуд прыгавор зацьвердзіў, але сакраціў «меру сацыяльнай абароны» на адзін месяц з вельмі цікавым «заключэньнем»: «Рыўкіна, як відаць, слаба ўсьвядоміла асновы самакрытыкі, яна думае, што можна крычаць **«усюды»,** ня ведаючы мяжы».

У часе перавыбараў сельсаветаў у Полацкай акрузе сераднік Лебедзь выступіў супроць кандыдатуры кулака Цыро (падатку плаціць 207 руб.) і сказаў, што Цыро кулак, былы кантрабандысты, і гэткія кандыдатуры ў савет не падыходзяць. Здавалася-б, што Лебедзь зрабіў добра, ён выканаў свой грамадзкі абавязак. Але-ж Лебедзя судзяць на 237 арт. К. К. і прысуджаюць да **«грамадзкага ганьбаваньня».**

А колькі выпадкаў было, што, паводле зьмешчаных у газэтах матар'ялаў, пракуратура адразу-ж патрабавала ад рэдакцыі адгаўрэ, або выкрыцьця псэўданіму. Напомнім толькі справу, па водле якое хацелі абвінаваціць намесьніка рэдактара газэты «Беларуская Вёска».

А колькі спынена спраў па іншых злачынствах! Пералічыць іх няма ніякай магчымасьці. А хаваць яны могуць усе артыкулы крымінальнага кодэксу.

У батракоў, нават **мапалетніх,** няма вы хадных дзён, спецвопраткі, працуюць яны без дагавору, а калі з дагаварамі, дык толькі «за харчы» пры бязьлітаснай эксплёатацыі. І вось, прысуды ў выпадках датэрміноваг звальненьня, або простага маншэньніцтва гаспадара: штраф у 50 кап., або тут-жа робіцца ганебны «гандаль», пры якім батрак на вачох суд ашукваецца.

А якая пяганіна ў перапісках, справы і паперы гадамі ляжаць бяз руху і адказаў. Нават сам апарат НКЮ БССР у гэтым выпадку ня лепшы ад сваіх падначаленых.

Пералічаныя факты мелі месца ў паасобных судовых установах, кампрамэтуючы сабой увесь у асноўным здаровы, апарат НКЮ БССР.

І ўсё гэта рабілі прадстаўнікі пралетарскага суда, рэвалюцыйнай законнасьці. Сярод іх, бязумоўна, шмат членаў партыі, якія ашукваюць і партыю і рабочую клясу. Судзьдзі ў гэтых выпадках трацілі сваю клясавую чуласьць, губілі арыентацыю, накрыліся цяжкім пластом бюракратычнае плесені і ў момант вельмі цяжкае работы—пераводу вёскі на сацыялістычныя рэйкі—рабілі справу ворага.

Мы падкрэсьліваем, што гэты матар'ял датычыць толькі пазначанай часткі судовых працаўнікоў. Увогуле, кадры суду і пракуратуры здаровыя, здольныя, правільна праводзяць лінію партыі і ўраду.

Гнілая частка судовых працаўнікоў павінна быць адсечана ад здаровага арганізму судовага апарату.

І гэта будзе зроблена.

Аркадзь РАСЛАЎСКІ.

МЕНСК

Арганізацыя 200 сталовых у калгасах

На пасяджэньні праўленьня Белкалгасцэнтру стаяла пытаньне аб арганізацыі грамадзкага харчаваньня ў калгасах БССР. Белкалгасцэнтр пастанавіў на працягу вясны і лета бягучага году арганізаваць у калгасах БССР, пераважна больш вялікіх, гаспадарча моцных, 200 сталовых з працускною здольнасьцю ня менш 500 абедаў у дзень кожная.

Белкалгасцэнтр даручыў усім акркалгассаюзам вызначыць калгасы, у якіх ёсьць больш спрыяючыя ўмовы для арганізацыі сталовых.

Белкаапсаюз узяў на сябе тэхнічнае абсталяваньне сталовых на падставе доўгатэрміноваг крэдытаваньня. На Белкаапсаюз падае таксама і забесьпячэньне сталовых спажывецкімі прадуктамі, арганізацыя кадраў працаўнікоў сталовых і г. д.

АРГАНІЗАЦЫЯ РАЙГАНДЛЯЎ

Наркамгандлю БССР увайшоў у СНК з прапановай аб арганізацыі раённых інспэктур гандлю, у першую чаргу, у раёнах суцэльнае калектывізацыі. Раённыя інспэкцыі гандлю будуць сачыць за поўным забесьпячэньнем калгасаў прамтаварамі. Адначасова раённыя інспэкцыі гандлю будуць сачыць за здачай калгасамі сваіх таварных лішкаў для забесьпячэньня гарадоў.

ЗАРПЛАТА АД'ЯЖДЖАЮЧЫМ НА РАБОТУ Ў КАЛГСАСЫ

СНК СССР выдаў пастанову, згодна якое зарплата, сутачныя, кватэрныя і праязныя грошы асобам, якія камандыруюцца ў раёны суцэльнай калектывізацыі для правядзеньня патрэбных мерапрыемстваў, выплачваецца за кошт установы, дзе яны працуюць.

НАВУКОВАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ДАКТАРОЎ—ЗАМЕСТ МЭДЫЧНАГА ТАВАРЫСТВА

Менскае мэдычнае таварыства ліквідавана. Замест яго пры ЦП саюзу мэдсанпрацы арганізавана навуковая асацыяцыя дактароў. У склад яе ўваходзяць усе дактары — члены саюзу мэдсанпрацы і працаўнікоў асьветы. Старшынёю асацыяцыі выбран праф. **Рубашоў.** Пры асацыяцыі арганізавана 15 сэкцый па розных галінах мэдыцыны.

РАЗЬВЯДЗЕНЬНЕ ЦУКРОВЫХ БУРАКОЎ У БССР

Калегія НКЗ БССР прызнала, што практыка апошніх двух год па разьвядзеньні цукровых буракоў пацьвярджае магчымасьць разьвіцьця ў Беларусі цукровай прамысловасьці.

Калегія намеціла рад мерапрыемстваў па разгортаньні цукровай прамысловасьці. У першую чаргу будзе прыступлена да пабудовы ня менш двух заводаў на апрацоўцы буракоў.

Наркамзем просіць саюзны Наркамзем і Цукратрэст забясьпечыць БССР насеньнем і штучным угнаеньнем з тым, каб ужо ў гэтым годзе можна было засеяць ня менш 500 гэктараў буракоў.

НОВЫЯ С.-Г. ТЭХНІКУМЫ Ў БЕЛАРУСІ

У бліучым годзе ў Беларусі адкрываюцца наступныя новыя с.-г. тэхнікумы: па буйной рагатай жывёле і малочнай гаспадарцы (Віцебшчына), па мясной справе (Ворша), па першапачатковай апрацоўцы і культуры ільну і канапель (Віцебшчына), па культуры і пераапрацоўцы бульбы (Бабруйшчына), па культуры балот (Мазыршчына), па збожжавых культурах і травах (Магілеўшчына), па барацьбе са шкоднікамі сельскае гаспадаркі (Гомельшчына), па мэханізацыі сельскае гаспадаркі (Горкі), па рыбаводзтве (Мазыршчына) і вэтэрынарны тэхнікум у Віцебску.

Тэрмін навучаньня ва ўсіх гэтых тэхнікумах, за выключэньнем Горацкага мэханічнага тэхнікуму, устаноўлены ў два гады.

САМААБКЛАДАНЬНЕ НА МЕНШЧЫНЕ ПАСТУПАЕ ДРЭННА

Паводле вестак АВК, збор сродкаў па самаабкладаньні па Менскай акрузе праходзіць вельмі марудным тэмпам.

Так, на 16-га лютага сабрана ўсяго каля 800 тысяч руб., што складае толькі 67 проц. заданьня па самаабкладаньні.

РВК і сельсаветы мала цікавіліся зборам сродкаў па самаабкладаньні.

ЛЕКЦЫІ АБ БІРА-БІДЖАНЕ

Нацкамісія пастанавіла запрасіць з Біра-Біджану тав. **Бэйнфэста** для правядзеньня ў БССР дакладаў і лекцый аб рабоце па зямляўпарадкаваньні працоўных яўрэяў у Біра-Біджане. Даклад тав. Бэйнфэста аб рабоце ў Біра-Біджане будзе пастаўлены і на пасяджэньні нацкамісіі ЦВК.

300 тысяч руб. на пабудову рабочага клюбу

СНК БССР прызнаў патрэбным пабудаваць новы рабочы клюб пры Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. Клюб будзе разьлічаны на 1000 чалавек. На будаўніцтва асігнуецца 300.000 руб. Клюб адкрыецца ў 1931 годзе.

Вытворчая нарада саўгасаў

У Цэнтральным Доме Селяніна адкрылася Менская раённая вытворчая канфэрэнцыя саўгасаў. Асноўную ўвагу канфэрэнцыя зьверне на пытаньне падрыхтоўкі саўгасаў Меншчыны да веснавое сяўбы.

ВЫШАЎ З ДРУКУ
№ 3-4 часопісі
„ПАРТЫЙНЫЙ РАБОТНІК"
(за люты месяц)
і дасылаецца падпісчыкам.

16 сакавіка, а 10 гадз. раніцы, у памяшканьні райкому КП(б)Б м-ка **КРЫЧАЎ** скліканцца рэдакцыямі газэт «Зьвязда» і «Камунар Магілеўшчыны» сумесна з Крычаўскім райкомам КП(б)Б

РАЁННАЯ НАРАДА СЕЛЬКОРАЎ Крычаўскага раёну, Магілеўскай акругі

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Задачы селькораў у раёне суцэльнай калектывізацыі.
2. Аб арганізацыі насьценных газэт пры калгасах.

На нараду павінны зьявіцца рэдактары насьценгазэт, усе рабкоры, селькоры і сьвенкоры. Запрашаюцца калгасьнікі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

У панядзелак, 10-га сакавіка, а 7-й гадзіне ўвечары ў **клюбе друкароў** адбудзецца пасяджэньне Белбюро сэкцыі працаўнікоў друку.

Парадак дня: 1. Абгаварэньне пастаноў пленуму ЦП саюзу друкароў, прынятых па дакладу Белбюро сэкцыі.
2. Аб курсах па перападрыхтоўцы кадраў—інфармацыя габінэту журналістыкі пры камвузе імя Леніна.
3. Даклад мясцкому «Бел. Вёскі» аб становішчы работы.
4. Арганізацыйныя пытаньні.

Запрашаюцца на пасяджэньне члены ЦК і ЦП саюзу друкароў і члены сэкцыі працаўнікоў друку.

Сёньня 9-га лютага а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні малой залі пасяджэньняў ЦК КП(б)Б адбудзецца нарада, склікаемая культпропам ЦК КП(б)Б (па сэктарах друку). У парадку дня пытаньне: **аб новых задачах друку, які абслугоўвае вёску** (аб характары газэты «**Беларуская Вёска**»). На нараду запрашаецца партыйна-камсамольская част-ка: газэты «Беларуская Вёска», члены калегій Наркамзему, члены праўленьня Калгасаюзу, члены прэзыдыуму ЦП саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, члены праўленьня каапэрацыйных саюзаў, Белсельбанку, Белдзяржстрах (Шчацька), Наркамгандаль (аддзел кантрактацыі), старшыня ЦК камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, бюро АК КП(б)Б, акрэа (загадчык і намесьнік), Навукова-дасьледчы інстытут (партыйная частка), рэдактары і загадчыкі вясковымі аддзеламі цэнтральных газэт і пэрсанальна: т. т. Азаронак, Мітлін, Дунец, Вітлін, Вайнштэйн, Міцькоў.

Паводле пастановы бюро Фрунзаўскага РК КП(б)Б для ўзмацненьня работы рэдкалегій насьценгазэт у парадку партнагрузкі прымацоўваюцца наступныя таварышы:

Ад рэдакцыі газэты «Зьвязда»: Асьмоў—да рэдкалегіі заводу «Камунар», Мітлін—да заводу, «Дрэваапрацоўшчык», Папоў—да Эльводу, Лаўкет—зав. «Пралетарый», Цудзін—зав. «Беларусь», Рабіновіч—ф-ка «Прагрэс», Такарчук і Жабінскі—ф-ка «Кастрычнік», Карачун—кандытэрская ф-ка, Эстрын—галянтарэйная ф-ка, Новікаў—скарняжная ф-ка, Сучкова—Наркампрацы і Красьнеўскі—шпалерная ф-ка; ад рэдакцыі газэты «Рабочий»: Якаўлеў—ф-ка «Чырвоны Тэкстыльшчык», Розэнблюм—Адда. хлебазаводу, Кобец—хлебазавод, Клопаў—п.-к. Паліграф, Сухараў—рымарная ф-ка, Цыткін—п.-к. краўцоў, Эйнштэйн і Клейнэр—Белдзяржбуд, Жардецкі і Смаль—Гандальбуд; ад рэдакцыі газ. «Аксцябр»: Дунец—друкарня БДВ, Рубінштэйн—саюз будаўнікоў, Гольдман—Белстромтрэст; ад рэдакцыі газ. «Чырвоная Зьмена»: Дзэлюк—Буд. Адда. БЖС, Самуцін—мэталяўстановы, Каганская—каап. прадпр. харчавікоў, Аніпчук—Наркамзем; ад рэдакцыі газ. «Савецкая Беларусь»: Шастакоў—ВСНГБ, Левін—Наркамасьветы, Скакальскі—Наркамгандлю, Маставы—ЦВК, Мядзьведзеў—СНК і Кучынскі—ЦСУ; ад рэд. газ. «Беларуская Вёска»: Шукевіч-Трацьцякоў—Акрэа і Горны—Акрфа; ад Белдзяржвыдавецтва: Календа—міліцыя, Чарот—ДЭТ, Цьвікевіч—пажарная каманда, Багушэвіч—пашт., тэл. кантора і Бэнгіна—Аўтакіраўніцтва; ад дзяржвыдавецтва РСФСР: Кугельман—сталоўкі МПРК.

Вылучаным таварышом у тыднёвы тэрмін нападзіць сувязь з рэдкалегіямі насьценгазэт, да якіх яны прымацаваны і дагаварыцца аб рабоце ў парадку нагрузкі. Апрача таго, вылучаныя таварышы аб усіх недахопах у рабоце рэдкалегій насьценгазэт павінны інфармаваць сэктар друку пры АПАД РК КП(б)Б.

СЁНЬНЯ:

Дом Камасьветы.—Групавая кансультацыя для прапагандыстых, завочнікаў і тых, што займаюцца самаадукацыяй, на тэму: **«Як працаваць над кнігай і газэтай».** Пач. у 19 гадз.—пакой № 6.

— Індывідуальная кансультацыя па эканоміялітыцы з 19—21 гадз.—пак. № 21.

— Заняткі гуртка па вывучэньні нямецкае мовы ў пакоі № 3 з 19-21 гадз.

Дом Асьветы. Сход камсамольскага калектыву працасьветы—у 19 гадз.

Пэдгабінэт. У 19 гадз. сход настаўнікаў другіх груп. Даклад Наўменка—«Элемэнты прыродазнаўства на другім годзе навучаньня».

ЖАКТ № 15. Пашыраная фракцыя камуністых, што жывуць у дамох Жакту № 15. Пач. у 18 гадз. Яўка абавязкова.

ЗАЎТРА:

Дом Камасьветы. У 19 гадз.—масавая кансультацыя «Амэрыканскі эканамічны крызіс і яго ўплыў на іншыя краіны» для парт. і камс. актыву (пак. № 19).

Дом Асьветы. У 20 гадз. вечар крытыкі і самакрытыкі працы фарпосту ў школе. Уступнае слова члена ЦК ЛКСМБ.

Перарэгістрацыя чытачоў б-кі Дому працасьветы адбудзе з 10 сак. па 1 крас. ад 18—22 гадз.

БДУ. Выбары прафкому факультэтаў народнае гаспадаркі і савецкага будаўніцтва—у 19 гадз. (ранейшыя выбары, што адбыліся 5 сак. выканбюро прафсэкцыі БДУ адмяніла). Яўка студэнтаў абавязкова.

Клюб «Чырвоны Будаўнік». У 19 гадз. куставы сход ячэек ЛКСМБ будаўнікоў гор. Менску. Дакл. ЦП саюзу буд. аб падрыхтоўцы да буд. сэзону. Яўка камс. яч. Белдзяржбуду, Менбуду, Белжылсаюзу, цагельных заводаў, прафкому будаўнікоў абавязкова.

У ДОМЕ КАМАСЬВЕТЫ адбудзе. даклад т. **СТАЛЕВІЧА** па падрыхтоўцы да ўсебеларускага палітбою на тэму: **«РЭВАЛЮЦЫЙНЫ РУХ Ў ЗАХ. БЕЛАРУСІ».** Білеты па райкомах КП(б)Б і ЛКСМБ. Пасьля дакладу канцэрт радыё-цэнтру.

АПА Фрунзаўскага РК КП(б)Б прапануе яўкайкам правесьці раетлумачальную работу сярод рабочых мас аб наборы ў Гомельскую сав. партшколу, кіруючыся правіламі прыёму, зьмешчанымі ў газэце «Зьвязда» за 20 лютага. Заявы з анкетамі ад жадаючых паступіць вучыцца прадставіць у АПА РК не пазьней 11 сакавіка.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР. Панядзелак, 10 сакавіка
Культаддзел ЦСПСБ і Дзярж. Яўрэйскі тэатр БССР
скліканць
КАНФЭРЭНЦЫЮ РАБОЧАГА ГЛЕДАЧА
ПАРАДАК КАНФЭРЭНЦЫІ:
Даклад аб рабоце тэатру.
Канцэртнае аддзяленьне.
Пачатак канфэрэнцыі а 7 гадз. Білеты ў культаддзеле ЦСПСБ

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР
Нядзеля, 9 сакавіка — С. ГОДЫКЗР.
адкрыты спэктакль.
ДЖЫМ КУПЭРКОП
Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру. Пачатак а 8 гадз. 30 м.

КІНО-ТЭАТР Культура
Лепшы фільм вытворчасьці „БЕЛДЗЯРКІНО"
У агні народжаная
мастацкі фільм у 6 частках з пралёгам.
Пачатак а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал
Новы фільм вытворчасьці Савкіно
БУНТ БАБУЛЕК
Звыш праграмы гастролі арт. дзярж. Ленінгр. тэатраў.
Сяргея ВРОНСКАГА
— зусім новы рэпэртуар —
Пачатак І-га сэансу а 7 гадз. увеч.
Каса адчынена ад 5 гадз.

КІНО Пралетарый
Тольки 3 дні 7, 8 і 9 сакавіка
МАСТАЦКІ БЫТАВЫ ФІЛЬМ
ЯЕ ШЛЯХ драма ў 7 част.
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса ад 5 г.

І-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
2 ФІЛЬМЫ Ў АДЗІН СЭАНС 2
1) **СЯРОД ЗЬВЯРОЎ** у 5-ы част.
2) **ЗА ЦЮЛЕНЯМІ** у 3 част.
— Штодзенна два сэансы —
Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м.
Каса—ад 12 гадз.

КІНО Спартак
Замежны мастацкі фільм
АПОШНІ ПАЛЁТ
драма з цыркавога жыцьця ў 6 частках
Каса—ад 5 гадз
Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. м.

ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛЬТЭРЫІ
Курсы рыхтуюць работнікаў для нізавых арганізацый, крэдытных таварыстваў, арцеляй усіх відаў, калгасаў, саўгасаў і г. д.
Тэрмін навучаньня 8 месяцаў.
Прымаюцца асобы з адукацыяй ня ніжэй 4 груп самігодкі. Прыём адбываецца круглы год.
Скончыўшыя курсы атрымліваюць адпаведныя пасьведчаньні.
Плата за курс 33 руб. уносіцца так: 9 руб. пры паступленьні, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8 месяц і па 4 руб. штомесячна ў пачатку кожнага навучальнага месяца. Умовы прыёму высылаюцца за 2 дзесяцікапеечныя маркі.
Усю карэспандэнцыю і грошавыя пераводы накіроўваць па адрасе: Менск, пошт. аб. скр. № 44.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Ад 10 сакавіка
замежны мастацкі фільм
ЧАЛАВЕК АГНЮ

Акц. О-во „ГОСМЕДТОРГПРОМ"
ПОКАЗАН к ПРИМЕНЕНИЮ ПРИ: артериосклерозе, старческой слабости, половом бессилии, неврастении, малокровии, миокардите и подагре.
СПЕРМИН-ФАРМАКОН (ВЫТЯЖКА ИЗ СЕМЕННЫХ ЖЕЛЕЗ)
ПРОДАЖА во всех аптеках и магазинах санитарии и гигиены СССР.
Цена за 1 флакон 1 р. 50 к.
При отсутствии препарата на местах, заказы и деньги направлять: Минск, Советская, 71, аптека Наркомздрава.
Генеральный представитель по БССР—БЕЛМЕДТОРГ.
Изготовление препарата производится под постоянным наблюдением консультантов-профессоров.

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКОСТЬ
ПРЕСКУРАНТ ВЫСЫЛАЕТСЯ БЕСПЛАТНО
ЦЕНА ФЛАКОНА 2 руб.
во всех аптеках.
При отсутствии высылаем 3 фл. за 4 руб. с пересылкой по получении задатка.
ЛАБОРАТОРИЯ КООПЕРАТИВА
ГАЛЕН-МОСКВА
МОСКВА 55, 2-ой ВЫШЕСЛАВЦЕВ ПЕР. 6

ДЕШЕВЫЙ СТОЛ
Повар. кн. 400 упрощ. вкусных питат. блюд **мясн., вегетар.** (завтр., обеды, ужин, десерт, настойки и др.) ц. 1 р. 25 к. Выс. нал. пл. Москва, Политехн. Музей, 110. Кооп.-т-во „КУЛЬТУРА и ЗНАНИЕ"

ЗГУБЛЕН 7-III па Савецкай вул. скрутак з чарцёжнымі прыладамі (вузкія лінейкі). Знайшоўшага прашу даставіць за узнагароду па адрасе: Інтэрнацыянальная, № 30, кв. 1.

ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ

АНРЫ БАРБЮС. РОЗНЫЯ ФАКТЫ. Стар. 203. Цана 1 р. 30 к.

НКА БССР.—**Грамадзка карысная праца ў савецкай працоўнай школе.** Стар. 60. Цана 35 кап.

А. КАПУСЬЦІН.—**„Уношу прапанову на агляд"**—Як арганізаваць грамадзка-вытворчы агляд на прадпрыемствах. Стар. 45. Цана 12 кап.

І. ВАЛОЦКІ.—**Заводы і палетні ў абароне.** Стар. 32. Цана 10 кап.

П. РАГАВЫ.—**Кароткі курс глебазнаўства.** Падручнік для сельска-гаспадарчых тэхнікумаў. Стар. 231. Цана 2 р. 10 к.

Бібліятэка школьніка. В. СІПОЎСКІ.—**Сіла невядомая,** апавяданьні. Стар. 83. Цана 35 кап.

Бібліятэка школьніка. ВАМБА.—**Хвосьцік,** апавяданьне ў малюнках. Стар. 116. Цана 65 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

НЕАБХОДНАЯ КНІЖКА
мэліяратарам, культуртэхнікам, аграномам, кіраўнікам калгасаў і саўгасаў, для бібліятэк аграпунктаў, калгасаў і саўгасаў,—
ВЫШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА Ў ПРОДАЖ
Праф. ДУБАХ—
Асушка, сельска-гаспадарчае выкарыстаньне і калёнізацыя балот у Нямеччыне.
Стар. 96. Цана 85 кап.
БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл. **2-49**

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл. **7-81**

...ргоўны нумар газэты ...іны дня

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўлітбел № 337.